Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КАСТРЫЧНІК 20 1933 г. ПЯТНІЦА № 232 (4776)

Год выдання XVII

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Совецкі лён павінен быць лепшым у свеце. П. ШАМШУР — Дні палітаддзела.

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТА ГК КП(б)Б аб святкаванні XV-годдзя УсеЛКСМ.

ПЯТНАЦЦАЦІГОДДЗЕ АССР НЕМЦАЎ ПАВАЛОЖЖА — Прывітанне ад ЦК УсеКП(б) і СНК СССР.

Па-большэвіцку змагацца за завяршэнне збожжапаставак у бліжэйшыя дні.

Спаборніцтва брыгад у калгасе «Трудавік», Лёзненскага раёна на права паслаць дэлегатаў на Кастрычніцкае свята ў Менск.

ЗА МЯЖОЙ:

ПРАЦЭС АБ ПАДПАЛЕ РЭЙХСТАГА — Парад ілжэсведак.

Фашызацыя Чэха-Славакіі.

Тав. Даўгалоўскі аб пазіцыі совецкай дэлегацыі.

ПЯТНАЦЦАЦІГОДДЗЕ АССР НЕМЦАЎ ПАВАЛОЖЖА

Прывітанне ад ЦК УсеКП(б)

Цэнтральны камітэт Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) вітае рабочых і сялян, комсамольцаў, комуністаў і кіраўнікоў аўтаномнай социялістычнай совецкай рэспублікі немцаў Паваложжа ў дзень яе XV-гадовага юбілея.

З прыгнечанай царскай правінцыі рэспубліка немцаў Паваложжа, дзякуючы ленінскай большэвіцкай палітыцы стала шпарка прагрэсуючай совецкай рэспублікай, поспехі социялістычнага будаўніцтва якой служаць прыкладам і заклікам да працэўных усяго света да барацьбы за сваё вызваленне ад помешчыцка-кулацкай кабалы, ад капіталістычнага прыгнёта, за права будаваць сваё жыццё па-калгаснаму, па-социялістычнаму.

ЦК заклікаў рабочых і сялян рэспублікі немцаў Паваложжа да далейшай энергічнай і самаадданай работы па ўмацаванню калгасаў і ператварэнню іх у сапраўды большэвіцкія, а ўсіх калгаснікаў у заможных, па ўзмацненню барацьбы з рэшткамі кулацтва і яго агентуры.

ЦК УсеКП(б).

Прывітанне ад СНК СССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР шле гарачае прывітанне рабочым, калгаснікам, калгасніцам і ўсім працоўным АССР немцаў Паваложжа ў сувязі з XV гадавінай з дня стварэння аўтаномнай рэспублікі.

З прыгнечанай царызмам вобласці, з вобласці, дзе шырокія масы працоўных жылі ў кабале ў помешчыкаў і кулакоў рэспубліка немцаў Паваложжа, дзякуючы ўмацаванню совецкай улады ў нашай краіне і няўхільнаму правядзенню ленінскай нацыянальнай палітыкі комуністычнай партыі, стала адной з перадавых рэспублік Совецкага саюза, поўнасцю ліквідавала непісьменнасць, паспяхова ідзе наперад па шляху культурнага і гаспадарчага ўздыму.

Ніякім намаганням нашага класавага ворага, адкуль-бы не рабіліся яго выпады і падкопы, не ўдасца перашкодзіць працоўным рэспублікі немцаў Паваложжа ісці да далейшых і яшчэ больш моцных перамог новага, калгаснага лада, да новых поспехаў у развіцці прамысловасці, да далейшага і яшчэ больш шпаркага паляпшэння сваёго жыцця.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР выказвае цвёрдую ўпэўненасць у тым, што працоўныя масы рэспублікі немцаў Паваложжа пад кіраўніцтвам нашай большэвіцкай партыі з гонарам выканаюць важнейшую задачу — зрабіць калгасы большэвіцкімі, і ўсіх калгаснікаў — заможнымі.

СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР.

СОВЕЦКІ ЛЕН ПАВІНЕН БЫЦЬ ЛЕПШЫМ У СВЕЦЕ

Совецкі лён—сыравіна для нашых тэкстыльных фабрык — **ПАВІНЕН БЫЦЬ ЛЕПШЫМ У СВЕЦЕ.** Пад такім лозунгам праходзілі работы маскоўскай абласной канферэнцыі ільнатрапальшчыц.

Ударніцы лепшых ільнаводчых калгасаў, надзяліўшыя сваім вопытам, на канкрэтных фактах паказалі, што гэты лозунг зусім рэальны. Канферэнцыя з усёй відавочнасцю на практыцы лепшых калгасаў паказала, што якасць ільнавалакна ў нашых руках. Перадавыя калгасы Маскоўскай вобласці здалі лён 21-м нумарам і ўцёрлі нос лепшым бельгійскім ільнаводам.

У нас, у БССР, зараз пачалася масавая пераапрацоўка ільну. Практыка першых дзён ільназагатовак паказвае, што наступаючае па загатоўчыя пункты валакно ў радзе раёнаў яе адпавядае якасным паказальнікам, вызначаным для гэтых раёнаў. Ільнавалакно паступае на многа ніжэй той нумарнасці, якая вызначана для таго ці іншага раёна.

Напрыклад, **ДУБРОВЕНСКІ** раён кантрольны нумар ільнавалакна мае 9-ты, а ідзе 6-м нумарам. Для **ЛЕЗНЕНСКАГА** раёна кантрольны нумар усталёўлен 10-ты, а першы партыі ільназагатовак паступілі 7-ра нумара. Такое-ж становішча ў **ШКЛОЎСКІМ, ЧАВУСКІМ** і некаторых іншых раёнах.

З некаторых раёнаў (Лёзна) мы маем трывожныя сігналы аб фактах псавання ільну на сцеліўчах з прычыны нядбайнага рассцілу і адсутнасці ў ўсяжнага кантролю за якасцю ільну. У калгасах і брыгадах не вылучаны людзі, якія-б адказвалі за якасць апрацоўкі ільну і здачу добраякасных ільнапрадукцый. Практыка перадавых калгасаў зусім не папулярызуецца.

У ходзе пераапрацоўкі і загатовак ільнавалакна выяўляюцца два адмоўныя моманты—запазданне апрацоўкі і, з прычыны гэтага, невыкананне ў тэрмін плана ільназагатовак (5,2 проц. гадавога плана на 15 кастрычніка) і зніжэнне нумарнасці, што значыць зніжэнне якасці здаваемага ільнавалакна.

У радзе месц зноў паўтараецца леташняя кулацкая практыка, калі на загатоўчыя пункты влазюць недобраякасную прадукцыю, а сапраўды добры лён асядае на месцы, у калгасе, разбазіраецца, расцягваецца кулацкімі агентамі.

Есць калгасы, дзе развязваюць так званы «Кадэ мы» з гнёздам на нумарах, дык падлягнем на калграхах».

Зразумела, што такія развязванні нікуды не вартыя, яны не толькі не ўзбройваюць на барацьбу за высокую якасць ільнавалакна, а, наадварот, дэмабілізуюць калгасныя масы. Такія развязванні толькі на руку кулаку і яго агентуры, якія імкнуцца перашкаджаць нам у барацьбе за высокаякаснае ільнавалакно.

Нашай прамысловасці патрэбен не брак, а валакно добрай якасці. Такога высокагатуновага валакна мы павінны дабівацца ў кожным калгасе, у кожнай калгаснай брыгадзе і адпаасобнай гаспадарцы.

Учора на старонках «Звязды» мы паказалі вопыт лепшага калгаса Дрыжскага раёна **«ПРОЛЕТАРЫЯ»** у яго барацьбе за лён, а таксама і метады, пры дапамозе якіх калгас дабіваецца высокай нумарнасці трасты.

Заслугоўвае ўвагі выступленне брыгадзіра другой і трэцяй брыгады гэтага калгаса — **Кладніцкага Васіля і Заводава Кастуся.**

— Наш калгас,—заяўляюць яны,—здаў сёлета дзяржаве трасту высокаякасную, пераважна другога нумара. А дабіліся мы гэтага ўпартай работай, штодзённымі клопатамі. За рассцілам сачылі, каб не густа ляжаў лён, каб не па зямлі голай, а на іржышчы. У жлівеньскія росы за разасланаю трастой сачылі штодня, а як толькі пачынала валакно адлузваць па ад трасціны, пасылаліся людзі для сартоўкі, каб далей не пусціць гнілі. Так мы сабралі трасту высокай якасці, упіхнуўшы страт. Уцямілі ў нас калгаснікі значэнне ільну—«калі мы здамо дзяржаве добраякасны лён, дык і хлеба даволі атрымаем».

Вось яна, сіла калгаснай ініцыятывы і арганізаванасці, вось як трэба змагацца за якасць ільнапрадукцыі. У ільнаводчым калгасе «Пролетарый» лён стаў сапраўды вядучай культурай і заваяваў належачае яму па праву пачэснае месца ў калгаснай вытворчасці. А такія мадэльнасці ёсць у кожным ільнаводчым раёне, у кожным ільнаводчым калгасе.

Сёння вырашае якасць ільнавалакна **трапальшчыца.** Ад яе работы зараз залежыць якасць бялізны і вопраткі для рабочых і калгаснікаў, якасць мяшкоў, брэзента і вяровак, так патрэбных прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

Набліжаецца фініш усебеларускай сталінскай ільнаэстафеты (5 лістапада), набліжаецца дзень здачы перадавых ільнаводчых калгасаў. Ён будзе праведзен у тым ільнаводчым раёне, які першым у БССР выканае план ільназагатовак, забяспечыўшы найлепшую якасць здаванай ільнапрадукцыі.

Сеннеўскі раён па прыкладу Маскоўскай вобласці зараз разгарнуў шырокую масавую работу вакол якасці апрацоўкі ільну. На 25 кастрычніка ў Сянно склікаецца раённая канферэнцыя лепшых трапальшчыц. Права на ўдзел у канферэнцыі атрымае тая трапальшчыца, якая выпрацуе ў дзень не менш 10 фунтаў добраякаснага ільнавалакна.

Дагэтуль у значнай большасці калгасаў працадзень на апрацоўцы ільну налічаўся толькі ў залежнасці ад колькаснага выканання нормы. У лепшых калгасах Сеннеччыны гэту справу парушылі перабудаваць так, каб адзнака работы стымулявала добрую трапальшчыцу. Гэта дасягаецца тым, што работа на апрацоўцы ільну будзе ацэньвацца ў залежнасці ад выканання нормы і нумарнасці ільну. Такі парадак адзнакі працы па апрацоўцы ільну прымусіць кожнага калгасніка клапаціцца адносіцца да трапання ільну і іншых працэсаў пераапрацоўкі.

Улічыўшы вопыт перадавых калгасаў Маскоўскай вобласці і БССР, па прыкладу Сянно, мы павінны зараз шырока разгарнуць паход за высокую якасць ільнавалакна, за ўцягнен не ўсіх ільнатрапальшчыц ва ўсебеларускую сталінскую ільнаэстафету, за права на ўдзел ва ўсебеларускім злёце перадавых ільнаводчых калгасаў, за права на ўдзел у кастрычніцкай дэманстрацыі ў Менску ў перадавой калоне лепшых калгасаў.

Максімальнай увагай ільнапрацоўцы, рашуча і бязлітасна пераматаючы супраціўленне кулацкіх элементаў, дабіцеся, каб па загатоўчыя пункты паўшло валакно высокіх нумароў, не ніжэй вызначанага для дагана раёна і калгаса.

БССР павінна паказаць узор барацьбы за высокую якасць ільнавалакна.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД ЦКК І „ЗВЯЗДЫ"

Наладзіць кругласутачную прыёмку і адрузку бульбы

ЧАВУСКІЯ І БАБРУЙСКІЯ ЗАГАТОЎШЧЫКІ САРВАЛІ ПАГРУЗКУ ПАДАНЫХ ВАГОНАЎ

Запазычанасць Ленінграду—52 т. тон

Ход адгрузкі на 19 кастрычніка (у тонах)

Назва арганізацыі	План	Адгружана: За дзень	Адгружана: З пачатку кампаніі	Проц. выкан. плана
Белкаапгародніна	157.270	5.237	133.091	84,6
Белплодагародніна	113.000	2.808	85.105	75,3
РАЗАМ:	270.270	8.045	218.196	80,7

Кантрольныя пасты выкрываюць бясчынствы пры прыёмцы

БАБРУЙСК.

Бабруйская РКК-РСІ сумесна з рэдакцыямі раённай газеты «Комуніст» і газетай калітаддзела Цялушскай МТС правяла рад практычных мерапрыемстваў па праверцы работы прыёмачных пунктаў і хода ўборкі ў калгасах.

Для правядзення рэйда, для дапамогі ніязаму актыву РСІ выехалі ў сельсоветы 10 чалавек. Адбылася нарада пастоў РСІ і лёгкай кавалерыі, прымацаваных да прыёмачных пунктаў. На час адгрузкі бульбы Ленінграду ўстаноўлены кругласутачныя дзяжурствы кантрольных пастоў.

14-га кастрычніка штаб рэйда ідраўёў нараду прадстаўнікоў райзага, воднага транспарта, Саюзтранса, чытункі, райзямаддзела і сігнальных пастоў, на якой заслуханы інфармацыі з месц аб ходзе адгрузкі.

Пасты РСІ «лёгкай кавалерыі» арганізавалі начны налёт на загатоўчы пункт у Качэрычах для праверкі стаповішча з аховай бульбы.

Пасты выявілі рад фактаў дастаўкі калгасамі недобраякаснай бульбы. Старшыня калгаса імя Варашылава тав. **Бандарэнка** прывёз 4 вазы непрабранай, непрасушанай бульбы і катэгарычна настойваў на яе прыёмцы. РКК-РСІ абвясціла суровую вымову тав. Бандарэнка і палярэдзіла ўсіх старшынь калгасаў раёна, што калі яны будуць пасылаць недобраякасную бульбу, усе выдаткі будуць аднесены за іх рахунак.

Пасля сігналаў кантрольных пастоў зняты з работы прыёмшчык **ХОРДАС** і вагаўшчык **ВАСІЛЕЎСКІ,** якія прымалі і адгружалі недобраякасную прадукцыю. Адданы пад суд прыёмшчык і памеснік дырэктара брозавага Дайнічава за прыёмку дробнай бульбы са скідкай у 5-50 проц.

Пасля таго, як чыгунка пачала падаваць вагоны без перабояў, аказалася, што райзаг зусім не падрыхтаваў для хуткай пагрузкі, не забяспечан рабочай сілай. Былі выпадкі прастояў вагонаў пад пагрузкай да 8-гадзін.

Для ліквідацыі прастояў РКК-РСІ ўзяла пад свой нагляд забеспячэнне пунктаў рабочай сілай і дабілася мабілізацыі з розных устаноў горада больш 200 чалавек.

У часе начных пагрузак бульбы пасты РСІ выявілі дрэннае абслугоўванне грузчыкаў. Рабочым прыходзілася хадзіць за вадой за поўкілометра і трацілі на гэта каля 30 мінут. Райзаг абяцаў плаціць па 30-50 руб. за пагрузку вагонаў бульбы, а пасля адгрузкі выплачваў толькі па 25 руб. Адсюль пасцаровыя пасты і народ рабочых і абвінавачванні загатоўшчыкаў у ашуканстве.

Пасты РСІ выявілі таксама нерацыянальнае скарыстанне аўтамашын, якія перавозяць бульбу з глыбінных пунктаў. Машыны загружаліся не поўнасцю. Мелі месца прастоі пры пагрузцы і выгрузцы з-за недахопу рабочай сілы. Былі выпадкі, калі машыны на праўдзу гадзіны шукалі месца выгрускі, бо райзаг не навяжмляў ім, куды трэба везці бульбу.

ХАСКІН.

Перавыканалі план

БЫХАЎ. (Па тэлеграфу).

17 кастрычніка Быхаўскі раён выканаў план адгрузкі бульбы Ленінграду. Заданне—7.120 тон. Адгружана 7.160. Фарсуем адпраўку гароднінны.

ХАСІН, СМІРНОЎ.

ПОЛАЦАК.

18-га кастрычніка Полацкі раён поўнасцю выканаў план адгрузкі гароднінны Ленінграду. Адпраўлена 550 цэнтн. капусты, 146 цэнтн. бручкі, 209 цэнтн. моркву і 280 цэнтн. буракоў.

Ермак.

На апошнім месцы

Наступныя раёны зрываюць адгрузку бульбы Ленінграду.

Паводле даных на 18 кастрычніка, Чырвонаармейскі раён адгрузіў 11,6 проц., Бярэзінскі—22,3 проц., Лагойскі—29,8 проц., Лоеўскі—38,9 проц., Рэчыцкі—36,8 проц., Уваравіцкі—40,6 проц., Прапойскі—41,8 проц., Буда-Кашалёўскі—48,2 проц., Парыцкі—46,9 проц., Церахаўскі—55,1 проц., Любанскі—57,5 проц., Крупскі—57,0 проц., Мсціслаўскі — 58,2 проц.

Зменшыўся падвоз да станцыі

БОРКАВІЧЫ. Дзякуючы арганізацыі кругласутачных работ, ст. Боркавічы МБВ чыгункі поўнасцю скончыла адгрузку падвезенай бульбы. Адпраўлена 87 вагонаў. Асаблівая ўвага звернута на хаванне і якасць адгружанай уся бульба высокагатуновая, сухая.

Недахопна ўзмацніць падвоз бульбы, паколькі нарастае патроза разрыў за паміж пастаўкамі і адгрузкай. За апошнія дні спатлівацца змяншэнне падвозу прадукцыі, бо раённыя арганізацыі, спадзяючыся на непадачу паражняка, аслабілі ўвагу да паставак.

ДАВЫДАЎ.

10 вагонаў пашлі паражняком

ЧАВУСЫ. (Наш кар.). За апошнія дні чыгунка па-ўдарнаму ліквідуе прагыў у адгрузцы. 15 кастрычніка на ст. Чавусы падана 35 вагонаў. Адтак, адгружана толькі 25, а 10 вагонаў пашлі паражняком. Поўную адказнасць за гэта нясе кантора Белплодагароднінны. Загадчык канторы **БАБЕНКА** нерацыянальна расставіў сілы, не хапала грузчыкаў. Для ліквідацыі прарыва былі мабілізаваны мясцовыя арганізацыі. Але кантора Плодагароднінны не арганізавала работ па адгрузцы. Бабенка апраўдваецца да тым, што не чакаў такой вялікай колькасці вагонаў, не быў падрыхтаваны аб гэтым, і таму не справіўся з нагачай прадукцыі.

Значная частка бульбы, якая ляжыць пад адкрытым небам, не адгружана.

За зрыў адгрузкі Бабенка павінен быць прыцягнут да адказнасці.

СКВЕРНІКОЎ.

САЎГАС УВАРАВІЧЫ ПА ЎДАРНАМУ АРГАНІЗАВАЎ УБОРКУ

УВАРАВІЧЫ. У гэтым годзе саўгас Уваравічы павінен убраць 120 га бульбы і здаць дзяржаве 320 тон. Да 4-га кастрычніка ўся бульба была поўнасцю ўбрана, да 12-га —96 га перабаранавана і 8 га пераарана.

Як саўгас дабіўся гэтага? Своячасова быў складзен календарны план уборкі бульбы. Планы былі дэтальна прапрацаваны на агульных сходах рабочых і па брыгадах. Складзены штодзённыя паказальнікі заданняў брыгад і выканання плана. Кожны рабочы ўжо ўвечары ведаў, колькі яго брыгада ўбала бульбы, як яна выканала заданне.

На полі, у брыгадах вывешваліся чырвоныя і чорныя дошкі, на якія заносіліся лепшыя ўдарнікі і гультаі.

На полі было арганізавана і грамадскае харчаванне. У абедзеныя перапынкі праводзіліся мітынгі і парады.

Паміж брыгадамі было разгорнута соцпаборніцтва.

Лепшыя вынікі дала брыгада **Майсеенкі. 14 жанчын выкапвалі 1,15 га** замест 1 га. Вялікую дапамогу ва ўборцы аказалі жонкі рабочых, якія выкрацавалі больш 400 чал. дзён.

Рабочыя саўгаса Уваравічы абавязаліся да 20 кастрычніка скончыць пастаўкі бульбы дзяржаве.

А. КАЗІМІРАЎ.

План перавыканан

БАРЫСАЎ. (Па тэлеграфу). 17 кастрычніка Барысаўскі раён скончыў адгрузку бульбы Ленінграду. Адпраўлена **5.500** тон пры плане ў 5.400.

***

ПЕТРЫКАЎ. (Па тэлеграфу). План адгрузкі бульбы Ленінграду ў 1.900 тон 17 кастрычніка поўнасцю выкапан.

Жукоўскі, Ліўшыц.

Залежы не ліквідаваны

ЗАСЛАЎЕ. Па станцыях «Беларусь» і Радашковічы ўжо 20 дзён ляжыць бульба, падрыхтаваная да адгрузкі. Чыгунка ўвесь час абяцае даць вагоны, аднак, не падае паражняка, і бульба пачынае псавацца. Патрэбна ўмяшанне прокуратуры.

Пост РКК-РСІ і РК ЛКСМБ.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

„Соцыялістычнае спаборніцтва гаворыць: дапамагай адстаўшым, даганяй лепшых—даб ся агульнага дзядма"

(Сталін)

Па прадстаўленню нараўлянскага РК КП(б)Б заносіцца на ўсебеларускую чырвоную дошку:

Калгас **«НОВЫ КАНАТСП»,** Нараўлянскага раёна

Калгас датэрмінова разлічыўся з дзяржавай па збожжапастаўках. З 36,7 тоны належачай бульбы, калгас па 1 кастрычніка здаў 29,5 тоны. Мяса з 26,4 цэнт. здана 22,75 цэнтнера. План здачы малака выканан на 102 проц. Калгас поўнасцю ўшёс абавязковыя плацяжы. Насенныя і страхавыя фонды сеўпаны.

На працадзень калгаснік атрымлівае 5,5 кгр. збожжа і 12 кгр. бульбы супроць 2,5 кгр. збожжа і 4,5 бульбы, атрыманых у мінулым годзе. Калгас сабраў з кожнага гектара 13 цэнт. жыта, 15,8 цэнт. ячменю, 10 цэнт. шпаніцы і 120 цэнт. бульбы.

Такіх вынікаў калгас дабіўся дзякуючы ўпартай барацьбе за ўраджай. Вялікая работа праведзена ў галіне асушкі ворнай плошчы—сракапана 5.000 пагонных метраў канаў. У выніку на балоце, дзе раней нічога не расло, сёлета добры ўраджай гарэшны. Праведзена поліва збожжавых і тэхнічных культур. У часе ўборкі вялася сістэматычная барацьба са стратамі: зграбанне каласоў, збожжаўлоўніцы.

Лепшыя калгаснікі-ўдарнікі: **Кавальчук Майсей,** былы партызан, арганізатар калгаса, зараз старшыня яго; **Трэцяк Філіп, Шмаргун Пятро, Кулажэнка Мікалай.**

Па-большэвіцку змагацца за завяршэнне збожжапаставак у бліжэйшыя дні

ДАБІЦЦА ВЫКАНАННЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ПА ЗДАЧЫ ЗБОЖЖА КОЖНЫМ КАЛГАСАМ, КОЖНАЙ АДНААСОБНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

РЭЗУЛЬТАТЫ „ГАЛАВАКРУЖЭННЯ"

24-га верасня Дзяржынская раённая газета **«Ўдарнік Дзяржыншчыны»** ў перадавым артыкуле аб збожжапастаўках выхваляючыся заявіла: «Не падлягае сумненню, што тэмпы сёлетніх збожжапаставак многа хутчэйшыя, чым у мінулым годзе. Жлівеньскі план мы выканалі датэрмінова і з перавышэннем».

Аднак, у гэтым-жа артыкуле газета была прымушана сігналізаваць аб рэзкім зніжэнні тэмпаў збожжапаставак у верасні, аб дэмабілізацыйных настроях у значнай частцы калгасаў і сельсоветаў.

Але ў раёне былі моцна захоплены жлівеньскімі поспехамі і сігналаў раённай газеты не пачулі. Збожжапастаўкі былі пушчаны па поўны самацёк. Так, яны «праводзяцца» і да гэтага часу.

У выніку Дзяржынскі раён злачынна сарваў выдзначаны ЦК КП(б)Б тэрмін скончэння збожжапаставак. На 15-га кастрычніка раён выканаў гадавы план толькі на 51,6 проц.

Райком і райвыканком кожную пяцідзённку атрымлівалі ад загатоўчых арганізацый зводкі аб ходзе збожжапаставак. Гэтыя зводкі гаварылі аб зніжэнні тэмпаў здачы збожжа, аб яўнай пагрозе зрыва вызначанага партыяй і ўрадам тэрміна скончання кампаніі. Аднак, РК і РВК не ўдарылі з усёй большэвіцкай рашучасцю па дэмабілізацыйных настроях на месцах, не прымялі мер да злосных сабатажнікаў збожжапаставак.

Праўда, РК і РВК прынялі пастанову аб ходзе збожжа- і бульбапаставак, але гэта пастанова не б'е па канкрэтных зрыўнічках збожжаздачы. У пастанове гаворыцца: «Замест балвой большэвіцкай барацьбы за датэрміновае выкананне планаў і работы па сушцы збожжа і здачы яго на загатоўкі, некаторыя старшыні калгасаў і дырэктары саўгасаў, а таксама парторгі сталі **на шлях простага ашуканства дзяржавы** і для адвода вачэй, бяздзям выконваюць план, вязуць дзесяткі цэнтнераў вільготнага і засмечанага збожжа, а потым прыпрыхвяюцца тым, што на складах ад іх не прымаюць (калгас імя СНК БССР — старшыня тав. **Логінаў,** саўгас Караліва — дырэктар **Арэхаў** і інш.)».

Здавалася-б, раённае кіраўніцтва павінна было моцна ўдарыць па гэтых апушчанцах дзяржавы, па «очковтирателях», якія імкнуліся здаць дзяржаве недобраякаснае збожжа. Але раённае кіраўніцтва гэтага не зрабіла. Яно абмежавалася толькі канстатаваннем атдзіных фактаў, а канкрэтныя посьбіты зла засталіся непакаранымі.

Не дзіва, што ў радзе калгасаў як і раней сабатуюць збожжаздачу. Старшыня калгаса **«Новы шлях»,** Вазерскага сельсавета, **КРАТОВІЧ** адкрыта заяўляе:

— Са збожжапастаўкамі няма чаго спяшацца, паспеем.

Гэтым калгас выканаў заданне толькі на 53 проц. Кулацкая агентура (Дзядзюля, Бязмен А.) арудуе ў калгасе, разваляе яго работу.

У калгасе **«Беларусь»** план здачы збожжа выканан толькі на 34 проц. Праўленне калгаса адкладае пастаўкі на невядомы тэрмін.

Асабліва недапушчальна праходзіць здача натураплаты МТС. На 15-га кастрычніка план здачы натураплаты выканан усяго на 37,6 проц. Гэта непасрэдны рэзультат адсутнасці баявой аператыўнай работы МТС, недацэнкі важнасці натураплаты з боку раённых арганізацый, сельсоветаў і праўленняў калгасаў.

Але калі калгасы МТС выканалі план збожжапаставак на 67,1 проц., іншыя калгасы — на 100 проц., дык аднаасобны сектар здаў толькі 42,2 проц. збожжа. Тут з усёй сілай адчуваецца ігнараванне аднаасобніка кіруючымі арганізацыямі раёнаў і сельсоветаў. Аднаасобны сектар па сутнасці прадастаўлен сам сабе. Ніякай масава-растлумачальнай работы, ніякай арганізацыі збожжапаставак ся роц аднаасобнікаў няма. Таму ў радзе сельсоветаў аднаасобнікі адкладваюць збожжапастаўкі да... снежня. На **Сталінскім** сельсавеце, напрыклад, аднаасобны сектар выканаў задание па збожжапастаўках на... 14,9 проц., па **Путчынскім** — на 16,2 проц.; па **Ляхавіцкім** — на 18,4 проц., па **Нарэйкаўскім** — на 19,7 проц. і г. д.

Нарэшце, зрыву збожжапаставак спрыяе адсутнасць націска на кулацка-заможныя гаспадаркі, ціпіа-ліберальныя адносіны да кулацкага сабатажа збожжаздачы. **На 15-га кастрычніка з кулацка-заможных гаспадарак не паступіла ні адкага цэнтнера збожжа.**

***

Дзяржынскі раён мае ўсе магчымасці, каб недакладна завяршыць збожжапастаўкі. Партыйныя і совецкія арганізацыі Дзяржынчыны абавязаны ў бліжэйшыя-ж дні мабілізаваць усе сілы на барацьбу за поўнае выкананне плана, забяспечыўшы найлепшую якасць здаваемага збожжа.

С. Г.

САЎГАСЫ БЕЛСАДГАРОДТРЭСТА СКОНЧЫЛІ ЗБОЖЖАЗДАЧУ

На 18 кастрычніка саўгасы Белсадгародтреста выканалі план здачы збожжа дзяржаве на 100,4 проц. Усяго здана 4.104,7 цэнтн. замест 4.103 цэнтн., вызначаных планам.

Дырэктар Белсадгародтрэста САМОХІН.

6 ДЗЁН НА ТЫДЗЕНЬ ПРЫЁМШЧЫКІ АДПАЧЫВАЮЦЬ

ШКЛОЎ.

Шклоўскі раён выканаў план збожжапаставак на 15-га кастрычніка толькі на 64,8 проц. Калгасы МТС здалі 37,7 проц., іншыя калгасы—83,9 проц., аднаасобны сектар—64 проц. План здачы натураплаты МТС выканан на 49,3 проц.

Адзай з прычын адставання раёна з'яўляецца тое, што кіруючыя арганізацыі не выконваюць дырэктыў партыі і ўрада аб наладжванні бесперапыннага паступлення збожжа з-пад малатарні на прыёмачныя пункты. Замест гэтага ў сельсоветах і калгасах захапляюцца арганізацыяй толькі «вялікіх» чырвоных абозаў і толькі па нядзелях.

Вось чаму па нядзелях ля загатоўчых пунктаў заўсёды можна бачыць велізарныя чэргі здатчыкаў, якія чакаюць па 8-10 гадзін, пакуль прыёмшчык нарэшце прыме ад іх прадукцыю. За тое ў іншыя дні ля прыёмачных пунктаў здатчыкаў амаль зусім няма.

Такая работа, стаўка на вялікія чырвоныя абозы раз у тыдзень прыводзіць да асядання збожжа на мясцах, да марудных тэмпаў збожжаздачы.

У раёне маюць месца спробы апушчаць дзяржаву, здаць ёй неканцыянальнае, нізкаякаснае збожжа. У гэтым напрамку няма належнай масава-растлумачальнай работы і кулацкая агітатура мае ўсе магчымасці разгортваць антыдзяржаўную агітацыю сярод працоўных аднаасобнікаў. Так аднаасобнік **Ільінскі** з Падгайцаўскага сельсавета прывёз на прыёмачны пункт збожжа на палову змешанае з кастрой. Такое-жа збожжа прывозілі аднаасобнікі з **Яганаўскага** сельсавета.

М. К—і.

КУЛАК НА ЧАЛЕ СЕЛЬСОВЕТА

ПОЛАЦАК. (Наш кар.).

Райком і РВК у сваіх пастановах аб выкананні плана збожжапаставак займаюцца толькі канстатаваннем фактаў, і далей гэтага не ідуць. Калі-небудзь прабуюць і капумець. Пасля пасяджэння бюро РК абвяшчаецца штурм, мабілізуюць адказных работнікаў на раён, але праз 2-3 дні зноў заціпша. «Мабілізавалыя» (Агур цоў, Гвяздзёў, Валенс) спакойна сядзяць у Полацку. Ім няма ніякай справы да таго, што план па збожжапастаўках выкананы на 15 кастрычніка толькі на 62,9 проц. Райком-жа задаволен тым, што афіцыяльна пастанова вынесена: «Выедуць-жа калі-небудзь»!

Затое раённыя арганізацыі моцна заклапочаны правядзеннем злётаў, парад, пасяджэнняў. З 1-га па 10-га кастрычніка ў раёне былі скліканы 4 злёты, столькі-ж парад і ў два разы больш збылося пасяджэнняў. Людзі занялася размовамі, а не штодзённым аператыўным кіраўніцтвам збожжапастаўкамі.

У раёне не бачаць класавага ворага, які злосна зрывае план збожжапаставак.

Дамнікоўскі сельсавет план збожжапаставак выканаў толькі на 30 проц. На чале сельсавета стаіць кулак **ЮДЗІЦКІ,** які на рачах у раённых арганізацыях праводзіць яўна антысовецкую дзейнасць і свядома сарвае пастаўкі збожжа.

Не гледзячы на тое, што замест па чыстцы партыі выкрылі кулацкі твар Юдзіцкага, бо яшчэ і дагэтуль «кіруе» сельсоветам. Юдзіцкі атрымлівае калгаснікаў, каб спачатку адпасеці размеркаванне ўраджаю па працадзнях, а потым прыступіць да здачы збожжа дзяржаве.

Класавы вораг імкнецца апушчаць дзяржаву, здаць ёй нізкаякаснае збожжа. Старшыня калгаса «Рабочы шлях» **КУПЧАНКА** прывёз на загатоўчы пункт 18 мяхоў недобраякаснага аўса, завярнуўшы яго зверху добрым і сухім.

У раёне ўсяго гэтага «не бачаць».

Л. Фрыд.

ПАРТЫИНАЕ БУДАУНІЦТВА

„МЫ ВЫКРЫВАЛІ І БУДЗЕМ ВЫКРЫВАЦЬ, ВЫГАНЯЛІ І БУДЗЕМ ВЫГАНЯЦЬ УСІХ ТЫХ, ХТО ДАЗВОЛІЦЬ САБЕ АШУКВАЦЬ ВЯЛІКУЮ ПАРТЫЮ ЛЕНІНА“ (*Кагановіч*)

У палоне „правадырства“

Гаруновіч прышоў на чыстку з выпрацаванымі загадзя тэзісамі. Апавяданне пра сваё далёкае мінулае па тэзісах ідзе плаўна і гладка як па асфальту..

— Мне дваццаць дзевяць год. Паходжу з сям'і рабочага-чыгуначніка. Свой лёс з маленства звязаў з партыяй. У юнацкім узросце ўступіў у КП(б)Б, пасля чаго мне прапанавалі ўступіць у камсамол...

Адну за другой выкладае па ўзнагародзячай лініі пасады, падкрэслівае іх важнасць і свае заслугі...

Не дачакаўшыся канца гэтай самарэкламы чалавека, ахопленага маніяй „правадырства“, камісія папрасіла гаварыць канкрэтней аб практычнай рабоце за апошнія гады.

— Як вядома, гаворыць Гаруновіч,— апошнія тры гады я ўзначальваў агітмасавы сектар ЦК КП(б)Б. Гэты перыяд супаў з актывізацыяй беларускай нацдэмаўшчыны. Прыехаўшы ў Беларусь, я ўключыўся ў барацьбу, якую вяла КП(б)Б супроць нацдэмаў і нацыянал-эпартуністаў.

Гаруновіч «уключыўся». Але як-жа ён змагаўся?

У чым, дзе і калі ён правяў сябе ў гэтай барацьбе — натуральна паўстае пытанне на чыстцы, дзе прапагандуецца аддалёнасць партыі кожнага партыйца не на словах, а на канкрэтных справах. Тым больш гэта прад'яўляецца Гаруновічу, як былому надаўна членам ЦК КП(б)Б і кіраўніку аддзела агітмасавай работы. Ці выкрыў Гаруновіч каго-небудзь з нацыянал-эпартуністаў, з якімі ён у свой час якшаўся? Ці выкрыў каго-небудзь канкрэтна з беларускай нацдэмаўшчыны, якая звядала свае контр-рэвалюцыйныя намеры на важнейшых участках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва? Нічога падобнага. Барацьбу з буржуазнымі нацыяналістамі і ўхілістамі ад ленінскай лініі ў нацыянальным пытанні ён укладваў у рамкі казенных выступленняў на сходах і на радыё.

Праўда, Гаруновіч залічвае яшчэ ў свой баланс барацьбу па нацпытанні, якая выдана ім у 1930 годзе. Хто чытаў, той ведае «каштоўнасць» гэтай кнігі. Аўтар у гэтай, з дазволу сказаць «працы», характарызуючы сутнасць ухілаў да вялікадзяржаўнага шавінізма і мясцовага нацыяналізма, прапагандуў палітычна шкодную блытаніну, друкуе сказіў зусім ясныя і выразныя ўстаноўкі партыі па гэтым пытанні; паставіў усё «на галаву», чым толькі дэзарыентаваў чытача.

І сёння на чыстцы Гаруновіч адносна гэтага абмяжоўваецца даведкай: «Такая кніжка ёсць у свеце, былі памылкі, і я іх прызнаў у свой час». Крохка. Далей гэтай даведкі Гаруновіч не ідзе. Даць палітычную ацэнку дапушчанай памылцы ў яго не хапае большэвіцкай шчырасці.

Як вядома, у мінулым годзе правядзенне збожжапаставак у Беларусі было спаткана асабліва ўзмоцненым супратывам кулацкіх элементаў. Класавы вораг у барацьбе за зрыў важнейшых мерапрыемстваў народа выступаў пад фальшыва-нацыянальнымі сцягам. На фронт збожжапаставак ЦК КП(б)Б мабілізаваў увесь цэнтральны партыйны актыў, у тым ліку быў пасланы і Гаруновіч. І вось у такі найбольш напружаны час барацьбы за перамаганне кулацкага супраціўлення, за выкананне адказнейшай дзяржаўнай задачы па збожжазагатоўках, не гледзячы на спецыяльную пастанову ЦК аб забароне выезда з раёнаў, Гаруновіч пакідае раён і дазвольвае у Менск на апачынак, не забяспечыўшы ніякага апору ў даручанай яму рабоце. Толькі тады, калі ЦК абвясціў яму вымову, ён вярнуў ся зноў у раён. Аб чым гэты факт гаворыць? Ён гаворыць аб тым, што Гаруновіч не хацелася быць там, дзе ідзе абвостраная класавая барацьба, ліквідуе за лепшае сядзець у цішы кабінета.

Паданымі фактамі далёка не вычэрпваецца характарыстыка твара Гаруновіча. Гэты чалавек з'яўляўся патхнілцелем і пасярэднікам групаўшчыны, якая мела месца ў КП(б)Б.

— Чаму нічога не сказана аб вашым дачыненні да групаўшчыны? — заўважыў старшыня праверкома т. **Гарагляд.**

— Хто, я? Не ведаю аб існаванні такой, не магу сказаць што-б прымаў удзел — пазнічае Гаруновіч.

Пасля таго, як «непомяшчаму» такіх спраў Гаруновічу камісія дала некаторыя наводзячыя пытанні, ён заявіў:

— Чуў гутаркі па ўзнікшых пытаннях...

— Толькі чуў?

— Паколькі гутаркі хадзілі, я не мог (?!) быць ізаляваным, абменьваўся адночыя думкамі з таварышамі, але-ж не мусіраваў групаўшчыны.

— А хоць-бы і гутаркі па закутках, як вы іх палітычна расцэньваеце?

— Пакуль не было пастановы ЦК УсеКП(б), я мог выказваць свае погляды ў партыйным асяроддзі, атрымалі пастанову, я рукі па пэрах, як салдат партыі.

Гэтай заявай «салдат» Гаруновіч выдаў сябе з галавой. Калі гутарка ідзе аб яго ўдзеле, аб беспрынцыпнай антыпартыйнай групаўшчыне і месніцтве, накіраваных на дэзарганізацыю работы, Гаруновіч нахабна імкнецца давесці сваю рацыю, спасылаючыся нават на большэвіцкія прынцыпы дэмакратычнага цэнтралізма. Стаць на такі шлях спраўдання антыпартыйных учынкаў, смазаць сваю цвікую віну перад партыяй могуць толькі людзі, якія канчаткова страцілі большэвіцкі твар.

Будучы загадчыкам агітмасавага сектара ЦК, Гаруновіч адначасова лічыўся і старшынёй ЦС аўтадарожнай арганізацыі. Мы гаворым «лічыўся» таму, што ён нічога там не рабіў, апрача таго, што культываваў сямейнасць і падхалімства. Пры такіх умовах апарат ЦС аўтадора аказаўся засмечаным чужымі, класава-варожымі элементамі, якія развалілі гэту арганізацыю. Гаруновіч займаецца «очковтирательством», складае справаздачы і дакладнае Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б аб «вялікіх дасягненнях у рабоце гэтай арганізацыі».

У пачатку 1932 г. оклікаецца ўсебеларускі з'езд аўтадора. З прычыны таго, што на месцах за выключэннем 4-5 гарадоў ячэйкі аўтадора фактычна не існавалі, на з'езд паехалі выпадковыя людзі, якія нікім не выбіраліся і не ўпаўнаважваліся. Гэта паклала свой адбітак на работу з'езда. Замест таго, тыкі выкрыць крычыны правала работы арганізацыі і вінаватых у гэтым, прыбуча з'езда ператварацца ў месца спеваў хвалебных дыфірамбаў кіраўніцтву. Больш таго. Найбольш блізкія стаўчыя да Гаруновіча чыноўнікі з ЦС аўтадора тут-жа арганізавалі выступленне з прапановай прэміяваць Гаруновіча аўтаматыкай за яго «выдатныя заслугі» па кіраўніцтву аўтадорам. Ступень гэтых «заслуг» відаць з пастановы ЦС КП(б)Б, у якой адзначана, што «аўтадорагая арганізацыя, як масавая арганізацыя, не існуе».

Як бы ў даным выпадку разгаваў на падобныя прапановы аб падарунках сапраўдны комуніст?

Безумоўна не толькі адмовіўся-б, а выкрыў-бы сутнасць і самым рашучым чынам асудзіў-бы арганізатараў гэтай падхалімскай зацеі.

А Гаруновіч? Ён не з такіх! Гутарка ідзе не аб дробязі якой небудзь, накшталт партфеля, а аб машыне, ды яшчэ якой: новенькай, сваёй **упаснай.**

Ахоплены такімі марамі гнілы абываталь Гаруновіч падымаўся з крэсла, чыпіла і ўдзячна ківаў галавою перад аўдыторыяй. А праз некалькі дзён ён сядзеў ужо на ўласным аўто і любаваў ся добрай работай новенькага матора... Факты злоўжывання службовым становішчам, незаконнага прысвоєння машыны яго нікольні не турбавалі.

У лютым месяцы Гаруновіч быў пасланы ў Лёзненскі раён у якасці сакратара райкома. Не апраўдаў ён давер'я партыі і на гэтай рабоце. Там ён у найбольш яркім выглядзе паказаў сябе адарваным ад мас, чыноўнікам з прыкмётнымі яму ўласцівасцямі «павятовага правадырства».

Пасля ўсіх гэтых фактаў у Гаруновіча хапае нахабнасці таварыць на чыстцы аб сваім змаганні за лінію партыі.

Змагаўся на словах, а на справе сабатаваў пастановы партыі, сваімі антыпартыйнымі паводзінамі і ўчынкамі толькі ганьбіў начэснае імя комуніста.

У асобе Гаруновіча ўцелясняецца двурушнік і кар'ерыст, ад якіх партыя ачысчае свае рады.

Я. Ів.

Вялікадзяржаўнік выкрыт

Ва ўмовах БССР вялікадзяржаўны шавінізм праяўляецца ў форме адмаўлення беларускай мовы, у кагардлівых адносінах да мовы, у актыўным і пасіўным супраціўленні справе беларусізацыі, у непаадэкватным значэнні беларусізацыі, што, быццам, беларусізацыя патрэбна толькі ва ўстановах, якія непасрэдна ў сваёй працы датыкаюцца з вёскай, а ва ўсіх іншых установах ужыванне беларускай мовы непатрэбнае рэчы г. д.

Зразумела, што ў сучасных умовах, пашага сацыялістычнага будаўніцтва ўсе гэтыя погляды выказваюцца не адкрыта, а замаскавана, у розных завуаляваных формах.

Вялікі характарнымі з гэтага пункта погляду з'яўляюцца факты, выкрытыя пры персанальнай чыстцы партыйца **Свярдлінскага** (парт'ячэйка ВЭО, Менск).

Свярдлінскаму пры чыстцы партыі ў 1929 годзе была абвешчана вымова за ігнараванне беларускай мовы. Але, не гледзячы на гэта, ён і дагэтуль ігнаруе беларусізацыю.

Чаму?

У часе персанальнай чысткі Свярдлінскі растлумачыў гэта наступным чынам:

— Бачыце, **пісаць праекты на беларускай мове вельмі цяжка, бо тэхнічныя тэрміны, якімі прыходзіцца карыстацца ў праектах, ні ў якім разе нельга выразіць на беларускай мове.**

Выходзіць, Свярдлінскі зусім не супроць беларускай мовы наогул. Ён, калі жадаецце, згодзен, каб ужываць беларускую мову, напрыклад, у зямельных, у каапэрацыйных і інш. такіх установах. Але, даруйце, толькі не ў ВЭО. Пісаць праекты, дзе ўжываюцца тэхнічныя тэрміны, куды ўжо тут, — разважае вялікадзяржаўны шавініст Свярдлінскі, — карыстацца беларускай.

Вось як «нявінна» завуалявана выступае зараз вялікадзяржаўнік.

Але сход па чыстцы выкрыў манеўры вялікадзяржаўнага шавініста. Прысутныя на чыстцы рабочыя далі рашучы адпор Свярдлінскаму. Таварышы зусім правільна ўказалі, што не толькі ў ВЭО, і не толькі ў праектах, але ў больш цяжкіх і складаных тэхнічных работах ужываецца беларуская мова, што мы ўжо маем шмат работ — навуковай, тэхнічнай літаратуры, падручнікаў па спецыяльных дысцыплінах — на беларускай мове, на якой вучыцца пролетарская інтэлігенцыя ў нашых беларускіх ВНУ.

Але Свярдлінскі ўсе гэтыя факты свядома абыйшоў.

Цікава прасачыць, што з сябе пагогул прадстаўляе Свярдлінскі.

Пры персанальнай чыстцы ён прабаваў утаіць сваё прабыванне ў горадзе Бабруйску ў часе белапольскай акупацыі. Свярдлінскі прабаваў давесці, што ў часе белапольскай акупацыі ён выязджаў з Бабруйска ў Смаленск. На самой-жа справе высветлілася, што ён увесь час заставаўся ў Бабруйску ў белапалякаў і прыцяпіваўся імі для выканання розных работ, як мастак (ён і сам прызнаўся, што маляваў арлоў на аўтамабілях і г. д.).

У часе падрыхтоўкі да чысткі асабістых картак комуністаў, калі Свярдлінскаму былі ўпісаны ў вучотную картку ўсе яго спачынкі, ён падаў заяву аб выхадзе з партыі: Выступаўшыя на кандыдатуры Свярдлінскага таварышы яшчэ дадалі, што Свярдлінскі, працытаўшы аднойчы ў газеце пастанову ўрада аб жыллёвым падатку, рэагаваў на гэта наступным чынам: «Яны зноў выдумалі нейкі свінскі закон».

Вось сапраўдны твар чужака, класавага ворага, які, прыкрываючыся партыйным білетам, заяўляе, што «тэхнічныя тэрміны нельга выказаць на беларускай мове». На самой справе Свярдлінскі, карыстаючыся прытушэннем класавай пільнасці партыйцаў, якія яго ведалі, быў наслядоўным вялікадзяржаўным шавіністам і ставіў сваёй мэтай сарваць правядзенне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі аб правядзенні беларусізацыі.

Уклін у бок вялікадзяржаўнага шавінізму з'яўляецца галоўнай небяспекай на даным этапе, бо «ён у сваю чаргу стварае спрыяючую глебу для распальвання нацыяналістычных пачуццяў сярод мас і тым самым узмацненне класіцы мясцовых буржуазна-кулацкіх і байскіх элементаў і іх суўдзельнікаў ушутры партыі» («Праўда», 10 сакавіка 1933 г.).

Вось чаму неабходна, асабліва ў ходзе чысткі, з усёй большэвіцкай жорсткасцю выкрываць твар вялікадзяржаўных шавіністаў, іх абаронцаў і вычышчаць іх з радоў нашай партыі.

М. З.

УСХАМЯНУЛІСЯ ТОЛЬКІ ПРАЗ НЕКАЛЬКІ ГОД

10 кастрычніка на партыйна-комсамольскім сходзе менскага аўтадарожнага рабфака разглядалася справа студэнта **Зарэцкага** — комсамольца і кандыдата партыі. Справа гэта мае надзвычай важнае палітычнае значэнне. У чым яе сутнасць? Студэнт Зарэцкі на працягу доўгага часу выказваў троцкісцкія погляды.

З'яўляючыся ў 1932 годзе сакратаром комсамольскай ячэйкі, Зарэцкі браў стаўку на выключэнне з комсамола студэнтаў рабфака—калгаснікаў т. т. **Бурага, Завалодскага** і інш.

Троцкісцкія погляды на сялянства Зарэцкі асабліва ярка праяўляў у часе набора на рабфак новага папаўнення ў гэтым годзе. Калі яму даручылі размясціць у інтэрнаце прыняцых студэнтаў сялян, то ён адмовіўся, заявіўшы: **«Няма чаго вазіцца з сялянамі, ім не месца на рабфаку».**

У часе выезда студэнтаў на работу ў саўгас **Анатоліна** Зарэцкі, спекулюючы на неадвалыяючай арганізацыі харчавання, актыўна агітаваў за зрыў работы на полі.

— Як нас кормяць, так трэба ім і працаваць — заяўляў ён.

Нарэшце Зарэцкі ў гутарках асобнымі студэнтамі проста гаварыў: **«З Троцкім партыя паступіла няправільна, Троцкага не зразумелі...».** Такім чынам, у твары Зарэцкага мы маем ад'яўлепага троцкіста.

Аднак, ні партыйная, ні комсамольская ячэйкі, ні адміністрацыя рабфака да гэтага часу выступленнем Зарэцкага не давалі рашучага адпора. Яго абвінавачвалі ў развале работы комсамольскай ячэйкі, у бузацерстве, але аб троцкісцкіх вылазках і слова не сказалі.

Больш таго, спрод комсамольцаў рабфака знайшліся абаронцы Зарэцкага. Так, калі па сходзе студэнтаў у саўгасе разглядалася справа аб агітацыі Зарэцкага за зрыў работы, комсамолец **Гельфанд** выступіў у абарону яго. Характэрна, што Зарэцкі прабаваў выкарыстаць для сваёй абароны асобных, мала свядомых комсамольцаў. Комсамолца **Валуя** ён пад гаварыў, каб той выступіў па сходзе супроць пастановы бюро парт'ячэйкі аб выключэнні Зарэцкага з партыі. І трэба сказаць, што гэты нумар напалову яму ўдаўся. Комсамолец Валуй на сходзе выступіў, даказваючы няправільнасць пастановы бюро парт'ячэйкі. І толькі пасля таго, як друзгія комсамольцы выкрылі змову Зарэцкага в Валуем, апошні сазнаўся ў сваім антыкомсамольскім учынку і тут-жа на сходзе асудзіў яго. Партыйна-комсамольскі сход Зарэцкага з партыі і комсамола выключыў і паставіў пытанне перад адміністрацыяй аб выключэнні з рабфака.

Хто-ж такі Зарэцкі? Ці з'яўляюцца выпадковымі яго троцкісцкія погляды на сялянства? Мінулае сведчыць аб тым, што Зарэцкі, як выхадзец з дробна-буржуазнай сям'і (сын саматужніка, які карыстаўся наёмнай працай да 1929 года), меў шчыльную сувязь са сваякамі бацькоў — рабінамі, якія нелегальным парадкам вучылі Зарэцкага ў **ешыбоце** (аўрэйскае духоўнае вучылішча). У 1930 годзе Зарэцкі паступае працаваць на завод імя **Варашылава,** дзе пад відам рабочага пралазіць у комсамол, а потым і ў партыю і, нарэшце, паступае на рабфак.

Такі твар Зарэцкага. Той факт, што ён на працягу доўгага часу не быў выкрыт, не гледзячы на адкрытыя троцкісцкія выказванні, сведчыць аб прытуплення класавай пільнасці ў комуністаў і комсамольцаў рабфака.

В. М.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА

ВЫРАЗНАЕ АПЕРАЦЫЙНАЕ ПЛАНАВАННЕ—ВАЖНЕЙШЫ ВАГАР УШЧЫЛЬНЕННЯ РАБОЧАГА ДНЯ

ПАВЯДЗЕМ БАРАЦЬБУ З РАСТРАТАМІ РАБОЧАГА ЧАСУ ЯК З ПРАГУЛАМІ

8.466 ПРАЦАДЗЁН НЕ ПРАДУКЦЫЙНАЙ РАБОТЫ

Чыстка партыйнай арганізацыі машынабудаўнічага завода імя **Варашылава** ўзняла творчую актыўнасць усяго рабочага калектыва ў барацьбе за павышэнне тэмпаў і якасці работы. Праміфінплан за 9 месяцаў г. г. па валавой прадукцыі выкананы на **102,6** проц. Краіна атрымала варштатаў і сашыян на **3.735** тысяч руб.

Варашылаўцы зрабілі значны крок наперад па выкананні і якасных паказальнікаў праміфінплана. У першыя месяцы гэтага года замест зніжэння сабекошта прадукцыі мелася павышэнне на **10** проц. Жлівень месяц даў рэзкае зніжэнне сабекошта на **4,9** проц.

Ударнікі завода імя Варашылава асвоілі цэлы рад новых для яго вытворчасцяй па выпуску складаных машын і варштатаў. Упершыню ў Саюзе імя Варашылава праўняна-хвойны брыкетны прэс, які пры яго выпрабаванні даў надзвычай высокі.

Асаблівыя поспехі мае кацельны цэх завода. Праміфінплан у ім перавыкананы на **29** проц. па валавой прадукцыі. Гэты цэх ужо выканаў заказ менскай ТЭЦ ка вырабу для яе каркасаў. Зараз рабочыя кацельнага цэха ўдарна працуюць па выкананні адказнейшага заказа для гіганта соцыялістычнай індустрыі — Кузнецбуда. Заканчваецца работа па выпуску велізарнага бака для коксавых установак Кузнецбуда. Бак каштуе каля 12 тыс. руб.

З такімі паказальнікамі варашылаўцы ўступілі ў рашаючы квартал першага года другой пяцігодкі. Сустрэць рэвалюцыйнае свята Кастрычніка з поўным выкананнем праміфінплана за Кастрычнік і на **62** проц. ліквідацыйскага задання да 7-га чысла — такую задачу ўзяў на сябе рабочы калектыў завода імя Варашылава. Абавязак адказны, пакручаны, але завод мае ўсе неабходныя прадпасылкі, каб ператварыць яго ў сапраўднасць.

Слабае звяно на заводзе — гэта арганізацыя пізавога вытворчага планавання і тэхнічнага нармавання. Арганізацыйныя непаладкі, міжцэхавыя супяжкі, перабоі ў графіках работы, — застаюцца і на сёнешні дзень бічом вытворчасці.

Асаблівая дрэнная справа ў такарным цэху, які стварае значныя перабоі і ў рабоце іншых цэхаў. Вось, напрыклад, першая група такараў атрымала вытворчае задание на кастрычнік месяц. Бюджэт рабочага часу — **2.150** варштатаў. Прайшло ўжо больш чым палова месяца, а планавае задание (планавік **Зельдзін**) не давядзена да варштатаў і на сёнешні дзень, не выпрацаван графік работы варштата і рабочага. У выніку — у рабоце самацёк, парушэнне планавага тэрміна апрацоўкі дэталей і перадача іх іншым вытворчым звенням.

Недарэмна зараз брыгада па зборцы 40-міліметравых зенітравальных варштатаў звярнулася да групы такараў, каб яны давалі ў тэрміны неабходныя дэталі і добрай якасці. Іх ужо назучыў горкі вопыт у мінулым, калі ў верасні брыгада недадала цэлых шэсць варштатаў на віне такараў.

Таксама нядобра стаіць справа на заводзе і з тэхнічным нармаваннем. Каля адной трэцяй часткі рабочых такарнага цэха недавыпрацоўваюць тарыф электычнікаў.

Адсутнасць выразнага аперацыйнага планавання, якое-б забяспечыла бесперабойны планамерны ход усяго тэхналагічнага працэса, слабая арганізацыя тэхнічнага нармавання выклікаюць вялікія страты рабочага часу. Вось характэрныя факты. Згодна падлікаў на правядзеных фатаграфіях рабочага дня ў некаторых цэхах і брыгадах, прадукцыйная праца аднаго рабочага ў сярэднім па ўсім заводзе складае **346** мінут. Такім чынам, штодзённа адзін рабочы недадае больш гадзіны прадукцыйнай працы пролетарскаму прадпрыемству. Што гэта азначае? Калі такім-жа непаладкі будуць цярпіцца і ў чацвертым квартале, то па ўсім заводзе імя Варашылава будзе патрачана дарэмна часу: па прычынах арганізацыйных няўвязак — **8.466** працадзён, па асабістых размовы — **3.386** працадзён, на курэнне ў часе вытворчай работы — **3.950** працадзён. Гэта азначае, што рабочым ўсяго завода імя Варашылава павінны былі-б працаваць калі 4-х дзён, каб пакрыць час, патрачаны толькі на адно курэнне, каля 8 дзён, каб кампенсаваць прарыў у рабоце завода па арганізацыйных непаладках і звыш 3 дзён, каб пакрыць час, патрачаны на асабістыя размовы.

Безумоўна, гэта фатаграфія рабочага дня ўсяго завода імя Варашылава з'яўляецца асабліва вострым пытаннем для фабрычна-заводскіх арганізацый і дырэкцыі завода. Так растранжыраваць рабочы час, прычыняць крупіцца варштаты ўхаластую сотні гадзін, стварыць такую вытворчую атмасферу, пры якой рабочы прадукцыйна працуе толькі 5-6 гадзін — так працаваць далей нельга! Прычыны такой агіднай запрузкі абстаяванні і рабочых завода толькі ў нас самих.

Пастаўце выразнае і аперацыйнае планаванне, давядзіце вытворчае задание да кожнага рабочага, складзіце штодзённы графік работы варштата і рабочага, наладзьце сапраўднае тэхнічнае нармаванне і сістэматычны інструктаж рабочых, разгарніце партыйна-масавую работу непасрэдна ў цэхах, брыгадах і толькі тады ваны абавязкі, таварышы варашылаўцы, са праўды ператвораца ў жыццё. **П. Ш.**

ПРЫТУЛАК АБЯЗЛІЧКІ

Наша панчошная фабрыка (Орша) павінна выпускаць кожны месяц прадукцыі больш чым на 20 тыс. руб. Сапраўднае-ж выкананне праміфінплана складае **50-60 проц.** Брак дасягае да **38 проц.**

На фабрыцы знайшла сабе цёплы прытулак абязлічка. Ніхто не адказвае за абсталяванне і інвентар. У выніку замест **35** звычайных машын на фабрыцы працуе **18,** ёсць 3 ксалёўкі, а працуюць 2. Даўно ўжо набыт аварачны апарат, але ў эксплаатацыю не пушчан.

Астатнія варштаты не працуюць, частка з іх патрабуе нязначнага рамонта. Няма ў запасе ніводнай іголкі. Усе 7 тыс.—паламаныя і ніхто аб набыцці новых іголак не думае.

Не лепш справа стаіць і з забеспячэннем фабрыкі сыццём і дапаможнымі матэрыяламі. На сёнешні дзень ёсць толькі 1 тона прадзіва і зусім няма фарбы.

Вельмі цяжкае фінансавае становішча фабрыкі. Запазычанасць яе зараз складае звыш **40** тыс. руб., у тым ліку за прадзіва—6 тыс. руб., за пасвачасовы рахунак—пені на тысячу руб., штраф—5 тыс. руб. Фабрыка ідзе ўсё больш і глыбей у яму, а дырэктар фабрыкі **Пішчэкер** не прымае ніякіх мер. Больш таго, калі яму паказваюць на недахопы работы, дык Пішчэкер гэта лічыць асабістым падыходам, ідыта яго жадаюць выжыць з прадпрыемства.

Нарэшце за дрэнную работу таварыства «Прыхільнік дзяцей», у ведамасці якога знаходзіцца фабрыка, зняла Пішчэкера з пасады дырэктара. РПС, не ўхаладзячы ў сутнасць справы, прапанае адзначыць Пішчэкера на рабоце і аплаціць за звальненне па **240** руб. ў месяц.

РК КП(б)Б і асабліва РПС не цікавяцца работай чашчай фабрыкі. Яны месяць лічаць яе «дробным» прадпрыемствам.

Патрэбна ўвага вышэй стаячых інстанцый, каб сапраўды вывесці фабрыку з ганебнага становішча.

Работаю

НА БАРАЦЬБУ ЗА ЭКАНОМІЮ АПАЛА

План чацвертага квартала гэтага года прадугледжвае для ўсёй прамысловасці БССР 524 тыс. тон умоўнага апалу, або—685 тыс. рэўметраў дроў, 240 тыс. тон торфа, 34 тыс. тон донвугля і г. д. Калі прыняць пад увагу, што ўдзельная вага прывозных відаў апалу вельмі нязначная (у агульным апалавым балансе капя 2 проц.), дык асноўным відам апалу ва ўмовах БССР з'яўляюцца дровы і торф.

Чацверты квартал у галіне забеспячэння апалам—самы напружаны квартал. Прамысловасць павінна квартал упушчанае і цалкам выканаць праміфінплан 1933 года. Адсюль асаблівая важная задача—поўнасцю забяспечыць прамысловасць і працоўных спажыццё апалам.

Як жа стаіць у нас справа?

Лесбел за 8 месяцаў выканаў праграму пастаўкі дроў толькі на 56 проц. Па спісу из 10 кастрычніка праграма выкананна на 64 проц. Такім чынам як Лесбел, так і Белоплёўканторга гаразда правалілі выкананне сваёй праграмы. Мы ўжо зараз мае такое становішча, што дровы і торф да чыгунак жа падвозяцца, а гэта пагражае нескарыстаннем пажарнага.

Лесбел і Белторф, якія з'яўляюцца галоўнымі пастаўшчыкамі апалу, не скарысталі ў бягучым годзе ўсе магчымасці, каб выканаць гадавы план. Справа ідзе поўным самацёкам. Няма увагі ў рабоце Лесбела і Белторфа з транспартнымі арганізацыямі па максімальнаму скарыстанню як чыгуначнага, так і інш. відаў транспарта для перавозкі апалу. Няма выразнага плана перавозкі дроў і торфа да самых чыгуначных пунктаў. У большай частцы гэта робіцца па-кампанейску, ад выпадка да выпадку. Усё гэта прывяло да глыбокага прарыва ў выкананні плана ў апошніх кварталах.

З наступленнем асенніх перавозак, безумоўна, пераважная частка чыгунак у першую чаргу абслугоўвае кліентуру, звязаную з пересоўкамі. Таму зараз, каб не апынуцца ў яшчэ большым прарыве, задача Лесбела і Белторфа—скарыстаць усе магчымасці, ўсе віды транспарта. Не толькі поўнасцю загрузіць пажарнае, але і скарыстаць бапастовыя вагоны і вяртушкі.

Задача зараз—забяспечыць свячасовую падвозку дроў і торфа да чыгуначных пунктаў.

Наркаматы і дырэктары прадпрыемстваў толькі пачынаюць варушыцца, галіне забеспячэння прадпрыемстваў апалам. Няма гаспадарчага падыхода, клопатаў, каб загадзя загатовіць апал, улічваючы навігацыйныя перыяды. Усе чакаюць, што апал даставіць нехта ім на прадпрыемства, без іх удзела.

Такі бядушны і значынны самацёк прыводзіць да раду астановак прадпрыемстваў з-за адсутнасці апалу. Наркамат абмяжоўваецца толькі дачай лімітаў прадпрыемствам. А як яны выдаткоўваюць і размяркоўваюць апал па падсобных цэхах і брыгадах—гэта праходзіць міма сектараў апалу наркаматаў. Адсюль і вялікі перавыдатак апалу.

Дырэктывы ўроду аб 15 проц. эканоміі ў гэтым годзе апалу ні адным наркаматам і большасцю прадпрыемстваў не выкананы. А што азначае 1 проц. эканоміі апалу? Гэта азначае эканомію ў 8,7 тоны ўмоўнага апалу, або 44 тыс. рэўметраў дроў. Пры кошце пастаўкі аднаго рэўметра дроў на прадпрыемствах 12-15 руб. мы атрымаем, што адзін процант эканоміі складае звыш 500 тыс. руб., а 15 проц. —капя 7,5 млн. руб. у год.

У сапраўднасці-ж перавыдатак на нашых прадпрыемствах дасягае 20-25 проц.

Адна з прычын такога значнага перавыдатка апалу безадказнае вядзенне складскай гаспадаркі. На менскай электрастанцыі ў першым паўгоддзі 1933 года мяўся значны перавыдатак апалу, асабліва дроў (15—20 проц.). Прычына вялікай вільготнасці торфа заключаецца ў безадказных адносінах да складскай гаспадаркі. Добраякасны торф ператвараўся пітаральна ў гразь. Не лепш становішча і на іншых прадпрыемствах.

Прафсаюзныя арганізацыі не разгарнулі яшчэ соцыялістычных метадаў барацьбы за эканомію апала. Яны не зразумелі яшчэ, што эканомія апала ёсць барацьба за патаннение прадукцыі і ўзмацненне нашых апалавых рэсурсаў.

БОНДАР В. М.

УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД ЗА ВЫСОКАЯКАСНУЮ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ

ЖАЛЕЗНЫ АДПОР КУЛАЦКІМ СПРОБАМ РАЗБАЗАРЫЦЬ СТАДА КАЛГАСНЫХ ФЕРМ

АДПОР ШКОДНЫМ ТЭНДЭНЦЫЯМ

Ліквідацыя бескароўнасці з'яўляецца надзвычай важнай палітычнай справай. Яна з'яўляецца арганічнай часткай лозунга тав. Сталіна «зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі».

Райвыканкомы БССР павінны закупіць і закантрактаваць **30 тыс. цёлак у калгаснікаў і аднаасобнікаў і 10 тыс. цёлак на калгасных таварных фермах.**

Ужо зараз трэба адзначыць, што за многіх раёнах галоўны ўпор у гэтай справе бяруцца не на закупку і кантрактацыю цёлак у калгаснікаў і аднаасобнікаў, а на перадачу цёлак і нават кароў з калгасных ферм. Гэта гаворыць аб уклыне класава-варожых элементаў, якія імкнуцца да разбазарвання калгасных ферм.

Гэты мацёр класавага ворага ва многіх раёнах не заўважаецца і не суспрэкае рашучага адпора.

У **Барысаўскім** раёне па плану РВК 74 калгаснікі павінны атрымаць цёлкі з МТФ, 219 па кантрактацыі ў калгаснікаў і 161 па кантрактацыі ў аднаасобнікаў. Пакуль што калгаснікі атрымалі цёлак толькі з агрэгаднага стада, а да кантрактацыі цёлак у раёне нават яшчэ не прыступілі.

Ёсць выпадкі, калі з МТФ замест цёлак выдаюць калгаснікам нецеляў, або проста кароў.

У калгасе **«Чырвоная ніва», БАБРУЙСКАГА** раёна бескароўным калгаснікам выдаюць з МТФ 3-хгадовых пакрытых цёлак, якія ў студзені 1934 года павінны ацяліцца.

У калгасе **«Чырвоны бераг»,** Пічнажаўскага сельсавета, **Аршанскага** раёна, у дзень ураджаю і калектывізацыі бескароўных калгаснікаў наравілі каровамі за наўмы разлік з агрэгаднага стада.

Згодна плана **Полацкі** раён павінен закупіць і закантрактаваць 695 цёлак для бескароўных калгаснікаў, але да гэтага часу атрымалі цёлак толькі 56 бескароўных калгаснікаў з... агрэгаднага калгаснага стада.

Калгасы імя **Варашылава** — Бельскага сельсавета і **«Чырвоная паляна»** — Алексеўскага сельсавета, шадзялілі бескароўных калгаснікаў цёлкамі выключна з агрэгаднага стада.

У калгасе **«Чырвоная Полаччына»** надзяленне бескароўных цёлкамі пачалося з разбазарвання калгаснай фермы. У калгасе **«Ленінскі прамень»** (Полаччына) план камплектавання МТФ яшчэ не выкананы, а старшыня райвыканкома **Жанкоўскі** загадзе праўленню калгаса выдзеліць 4 цёлкі для бескароўных.

Характэрна, што «Белта» ў бюлетэні ад 15 кастрычніка прапагандуе гэту практыку разбазарвання калгасных ферм, выстаўляе гэтыя калгасы, як узор паспяховага ажыццяўлення закона ўрада і партыі аб надзяленні бескароўных калгаснікаў цёлкамі.

Трэба рашуча ўдарыць па гэтых кулацкіх тэндэнцыях. Да суровай адказнасці за разбазарванне калгасных ферм!

У цэнтр работы па ліквідацыі бескароўнасці трэба паставіць разгорнутае кантрактацыі і закупкі цёлак да 8-міесячнага ўзросту ў калгаснікаў і аднаасобнікаў.

К. Н.

З ЧЫМ СУСТРАКАЕМ ЗІМУ

Наша жывёлагадоўчая брыгада МТФ калгаса **«Большэвік»** вельмі ўважліва абгаварыла адозву калгаснікаў **«Чырвоная Вясна»,** Ступкага раёна. Мы пераканаліся, што, скарыстаўшы вопыт гэтага калгаса, зможам значна лепш палапіць работу нашай фермы.

Наша ферма павінна да новага года мець 34 каровы, 20 падцёлкаў і 22 цёлят. Сёння мы ўжо маем 39 кароў, 21 падцёлка і 20 цёлят. Такім чынам план камплектавання фермы выкананы.

Трэба прызнацца, што, складаючы план таварнай прадукцыі па нашай МТФ, мы недаўлічылі ўсіх магчымасцяй. Напрыклад, меркавалі мы атрымаць 149 цэнтн. малочнай прадукцыі, але ўжо за першыя 8 месяцаў атрымалі 178 цэнтн., а да канца года мяркуем атрымаць яшчэ 80 цэнтн. Справа ў тым, што мы за гэтае лета як след узяліся за догляд кароў. І дабіліся таго, што замест спрэднягадовых 1.150 літраў на карову мы ўжо зараз маем **па 1.250 літраў.**

Мы датэрмінова разлічыліся з дзяржавай па здачы малака і мяса.

Гэта з'яўляецца вынікам добра наладжанай працы ў нашай брыгадзе. Кожны работнік фермы — ударнік.

За гэты год ферма ўжо дала калгасу 3.184 руб. чыстага даходу. Калгаснікі пераканаліся, што ферма не «аб'ядае» калгас, а з'яўляецца крыніцай даходу.

Кармамі ферма на зіму забяспечана. Маем 100 тон сена, 200 тон кармовай саломы і мякіны, 40 тон бульбы, 15 цэнтн. канцэнтратаў для маладняка і вытворнікаў. Заклалі мы таксама 60 тон сіласа. Так што кармоў хопіць.

Крыху горшая справа з аборай. Яна я

ЦЭЦ патрабуе дапамогі

Усё вышэй узнімаюцца сцены галоўнага корпуса Менскай ЦЭЦ. Сцены машыннага зала вырасці амаль да самага даха. Заліт фундамант пад турбагенератар. Заканчваецца заліўка фундамантаў пад катлы. Ідзе заліўка жалеза-бетоннай бункернай галярэі. Адначасова ідзе будаўніцтва размеркавальнай сістэмы, гідратэхнічныя работы і г. д.

Аднак, **тэмпы работ** не забяспечваюць сканчэння будаўніцтва ЦЭЦ да **1 студзеня**. На будаўніцтве ёсць яшчэ рад вузкіх месц, ёсць рад участкаў, якія патрабуюць дапамогі адпаведных арганізацый і пролетарскай грамадскасці.

Яшчэ 26 верасня ў «Звязде» была апублікавана пастанова ЦК КП(б)Б, СНК БССР і ЦСПСБ аб мерапрыемствах па пуску менскай ЦЭЦ у чацвертым квартале 1933 года. Пастанова да гэтага часу поўнасцю **не выканана.**

Самым вузкім месцам на будаўніцтве ЦЭЦ па-ранейшаму застаецца нехапат рабочай сілы. На сённішні дзень на будаўніцтве працуе 720-730 чалавек замест патрэбных 1000. ЦК КП(б)Б і старшыню прэзідыуму ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ у дакладны тэрмін забяспечыць будаўніцтва патрэбнай рабочай сілай. Было канкрэтна ўказана, што цеслярой трэба даць 150 чалавек і чорнарабочых 400 чал. Старшыні райвыканкомаў, сакратары райкомаў КП(б)Б і старшыні райпрафсаветаў былі абавязаны ў пяцідзённы тэрмін накіраваць на два месяцы ад кожнага раёна. Гэту дыпламатычную выканалі не больш 10 раёнаў. Толькі Бадоў — Магілеў, Барысаў, Шклоў, Талачын, Орша, Рагачоў і Бабруйск паслалі былі даць 180 комсамольцаў. Накуль што замест 180 комсамольцаў на будаўніцтва прыбыла толькі 38 чалавек.

Лоеўскі і Церахоўскі раёны павінны былі завербаваць для Менскай ЦЭЦ 400 чорнарабочых. ЦСПСБ ускладаў адказнасць за гэтую справу персанальна на **старшынь райпрафсаветаў.** Аднак старшыні райпрафсаветаў Ельска і Церахоўскі абмежаваліся развёрсткай нарада па калгасах замест асабістага апе рацыйнага кіраўніцтва вярбоўкай. Таму абодвы раёны да гэтага часу дырэктывы партыі і ўрада не выканалі.

Набліжаецца час мантажа абсталявання. Для гэтай работы патрэбны будуць 20 такелажнікаў, 30 слесараў, 70 абмуроўшчыкаў і 10 трубаправодчыкаў. Некаторую частку кваліфікаваных рабочых абяцае даць Цэнтраэнергабуд. Але слесараў прыдзецца знайсці тут у **Менску.**

Другім вузкім участкам на сённішні дзень з'яўляецца недахват вагонаў для вывазкі будаўнічых матэрыялаў. Канкрэтнае задание ЦК ушчувальнаму НКШЛ і камітэта па перавозках не выканана. Са станцыі Жодзіна засталося вывезці яшчэ 80 вагонаў камення. Опра на гэта вельмі тэрміновая, бо да пачатку халадоў трэба абавязкова забракаваць унутрыстанцыйныя шляхі. Са станцыі Коханава прывезены толькі 5-6 платформ лесаматэрыялаў замест 23. Са станцыі Талачын замест 17 плат форм прышлі 2-3. Са станцыі Калодзішчы павінны былі прысці 50 платформ з баластам. Аднак, чыгуначнае кіраўніцтва не дало ні аднаго вагона. На станцыі Віцебск замест 6 крытых вагонаў для перавозкі вапны далі толькі 1 вагон. Такім чынам, **непрадстаўленне вагонаў** з'яўляецца простай нагрузай нармальнаму ходу будаўніцтва.

Вельмі кепска таксама з **аўтатранспартам.** ЦЭЦ мае ўсяго 2 аўтамашыны па 2,5 тоны. Будаўніцтву патрэбна вывезці каля 500 тыс. штук цэглы. Абедзве машыны вывозяць у дзень, працуючы у 2-3 змены, не больш 10-12 тыс. штук цэглы. Гэтай нязначнай колькасці зараз хапае таму, што на будаўніцтве ў асноўным ідуць **жалезабетонныя работы.** Калі-ж прыдзецца запаўняць цэглай адлегласць паміж калонамі і патрэбна будзе штодзённа да 30.000 штук цэглы, тады 2 аўтамашыны не справяцца. Трэба абавязкова завезці запас цэглы не менш 150-200 тыс. штук. Просьбы кіраўніцтва ЦЭЦ аб прадстаўленні дадатковых аўтамашын не далі пакіх вынікаў. Між тым, пры жаданні можна назбіраць ЦЭЦ некалькі аўтамашын. У горадзе ёсць шмат гаспадарчых органаў, якія маюць аўтамашыны, працуючыя ў **адну змену.** На другую змену можна было-б гэтыя машыны назбіраць ЦЭЦ.

Даволі напружанае становішча на будаўніцтве з **харчаваннем рабочых.** Наркамснаб, якому пастановай ЦК было даручана вызначыць для ЦЭЦ харчовыя фонды, якія забяспечвалі-б харчаванне рабочых і ІТР па **устаноўленых нормах, «забыў»,** што апрача хлеба, пасбоўтачнай мукі і круп, у норму ўваходзіць таксама мяса, рыба і тлушчы. Не выканана таксама дырэктыва ЦК аб тым, каб адвесці ЦЭЦ для самазагатовак адзін **з бліжэйшых да Менска раёнаў.** ЦЭЦ як і раней загатоўляе прадукты ў парадку самазагатовак у **Камарынскім раёне.** Не гаворачы ўжо аб тым, што наогул у гэтым раёне цяжка папырыць самазагатоўкі, бо да раёна прымацавана Карэльская рэспубліка, але вывезці нават тую невялікую колькасць прадуктаў, якую ЦЭЦ загатоўляе, вельмі цяжка. Дырэкцыя Заходняй чыгункі **не дае вагонаў** для перавозкі прадуктаў з Гомеля ў Менск. Дырэктар дарогі **т. Жукаў,** не медлячы нават на просьбу **т. Гападзада,** замест трох вагонаў, даў толькі адзін ватон. Закуплены каровы, авечкі, свінні знаходзяцца ў Камарынскім раёне, з'ядаюць шмат кармоў, а сталовая ЦЭЦ варыць посныя абеды. Сталовая нават не мае ў выстарчальнай колькасці **гародніны.** У тым-жа Камарынскім раёне ляжыць загатоўленая гародніна, якую нельга прывезці з-за адсутнасці вагонаў. Белкаапсаюз гародніны не адпускае.

Жыллёвае будаўніцтва праводзіцца марудна. 48-кватэрны дом, які павінен быў быць скончан да 1 кастрычніка, будзе скончан не раней 1 лістапада. Спазненне **на месяц** кіраўніцтва ЦЭЦ тлумачыць недахватам рабочых. Лесапавабзыт, які павінен быў адгрузіць два стандартныя дамы да 6 кастрычніка, не скончыў адгрузку да гэтага часу: замест 21 вагонаў адгружана толькі 17 вагонаў.

Вялікую работу трэба яшчэ прарабіць на самой тэрыторыі ЦЭЦ. Між тым, на частцы адчужанай тэрыторыі жывуць яшчэ 8 прыватных сем'яў. Гэту частку тэрыторыі трэба дзівезаць, яна патрэбна для разгортвання будаўніцтва. Замест уключэння гэтага участка ў будаўніцтва, кіраўніцтва ЦЭЦ прымушана будаваць **агарожы** і гэтым затрымліваць і ўскарачаць работы. **Горсовет** добра аб гэтым ведае, але, не гледзячы на ўказанні СНК, не высылае прыватных жыхароў.

Вось асноўныя **вузкія ўчасткі** у будаўніцтве ЦЭЦ на сённішні дзень. Іх не было-б, калі-б усе тыя арганізацыі і установы, якім пастановай ЦК, СНК і ЦСПСБ даны **канкрэтныя даручэнні,** больш уважліва да іх адносіліся, калі-б яны ўлічылі ўсё вялікае значэнне свае часовага скончэння будаўніцтва ЦЭЦ для прамысловасці і гаспадаркі сталіцы БССР. Нядбайныя адносіны да будаўніцтва ЦЭЦ пагражаюць зарудкаванням будаўніцтва. Вінаватых у невыкананні пастановы ЦК, СНК і ЦСПСБ ад. 26 верасня трэба **прыцягнуць да адказнасці.** Трэба прымусіць асоб, адказных за вышэйпамянёныя канкрэтныя даручэнні, больш сур'ёзна адносіцца да дырэктыў партыі і ўрада.

Д.

Аб складзе ячэйковых камісій

Пастанова менскай гарадской камісіі па чыстцы КП(б)Б

Назначыць ячэйковыя камісіі па чыстцы мекпартарганізацыі ў наступным складзе:

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ ЯЧЭЕК БЕЛТОРФА, НДІ ПРАМЫСЛОВАСЦІ, НАРКАМЦЯЖПРАМА:

Старшыня — **ГІНДЭРСОН,** член партыі з 1918 г., рабочы-металіст, інжынер Галоўдартранса.

Члены — **ШУБ Ф. Г.,** член партыі з 1919 г., работніца; **СТЫРНЕ Г.,** член партыі з 1919 г., рабочы, работнік НДІ сельг. гаспадаркі.

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ ЯЧЭЕК БЕЛДЗЯРЖПРАЕКТА, БЕЛОВІНТРЭСТА, БЕЛАРУСКАЙ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ПРОБНАЙ СТАНЦЫІ І ПАПЕРТРЭСТА:

Старшыня — **РОЗІН,** член партыі з 1919 г., спружачы, аспірант Гістпарта.

Члены: **НОВАСЕЛЬСКІ А. О.,** член партыі з 1919 г., рабочы завода «Большэвік»; **ШНЕЕРАВА Л. Г.,** член партыі з 1924 г., работніца, культпроп друкарні імя Сталіна.

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КУРСАЎ ЧЫРВОНЫХ ДЫРЭКТАРОЎ, КЛІНІЧНАГА ГАРАДКА, КУРСАЎ ВКТС:

Старшыня — **АДЛЕРШТЭЙН С. І.,** член партыі з 1917 г., рабочы, пракурор НКЮ БССР.

Члены: **ЕЗЕРСКІ Л. К.,** член партыі з 1922 г., рабочы Друкарні імя Сталіна; **БАЛЬШОЎ Л. Г.,** член партыі з 1925 г. рабочы, член прэзідыума ЦК Чырвонага крыжа.

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ ЗАГАТЗБОЖЖА, МЕНЗАГАТЗБОЖЖА, ЗАГАТІЛЬНА:

Старшыня — **ДАБРЫНСКІ Я. П.,** член партыі з 1919 г., служачы, кіраўнік сектара працы Упаўнаркамлеса.

Члены: **СІЛАНЦЕЎ П. А.,** член партыі з 1924 г., рабочы камандзір танка; **БУКАНТЭС А. Г.,** член партыі з 1919 года, работніца, дырэктар начнога санаторыя.

МЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

ЗА ПРАВА ПАСЛАЦЬ ДЭЛЕГАТАЎ НА КАСТРЫЧНІЦКІЯ СВЯТЫ У МЕНСК

СПАБОРНІЦТВА БРЫГАД У КАЛГАСЕ „ТРУДАВІК"

ВЫКЛІК ПРЫНЯТ

ПАЧЫН БРЫГАДЗІРА ЗМІТРА

ЛЁЗНА. (Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

Калгас «Трудавік», Вупаўскага сельсовета, у раёне дзейнасці Лёзненскай МТС лічыцца перадавым.

Яравыя культуры з поля ўбраны даўно і поўнасцю. Ідзе малаціба. План збожжапаставак і натуранлаты МТС па жыту выканан, здана 71 цэнтн.; здана дзяржаве 336 цэнтн. бульбы — 100 проц. плана.

Але калгас далёка не поўнасцю разлічыўся з дзяржавай. Трэба яшчэ здаць 75 цэнтн. аўса, іншых культур 37 цэнтн., ільнанасення 60 цэнтн. (здана толькі 35 цэнт.), ільнатрасты 763 цэнтн., валакна 5 цэнтн. Трэба зяблева ўзняць 284 гектары, а ўзнята ўсяго каля 26 гектараў. Трэба зімоўку для жывёлы падрыхтаваць (у калгасе ёсць МТФ). Толькі пры поўным выкананні гэтых задач калгас сапраўды можа стаць перадавым.

Ці мае калгас магчымасць усе гэтыя работы закончыць у бліжэйшыя дні? Безумоўна, мае.

Чаму, напрыклад, не закончана збожжаздача? Аказваецца: вазілі авёс здаваць, але не прынялі з-за павышанай вільготнасці. Значыць, трэба сушыць. Так і рашылі ў калгасе. Нарада членаў праўлення і брыгадзіраў пастанавіла: скарыстаць для сушкі аўса ўсе печі ва ўсіх брыгадах, зрабіць у сушных памост, засланць пасцілкамі, мешкамі, патапіць печкі, рассыпаць авёс тонкім пластом, камешаць часта, каб раўнамерна сох. Да выканання гэтага прыступілі ўжо.

Брыгадзіры заявілі: 15-га і не пазней, г. зн. за 2 дні будзе перасушана ўсё збожжа і поўнасцю здана дзяржаве. Па-большэвіцку ўзяўшыся за справу, калгас поўнасцю разлічыўся з дзяржавай па збожжы.

Як важнейшая задача ў ланцугу сельска-гаспадарчых работ стаіць перамалацоўка ільну і здача яго дзяржаве. Тут калгас таксама не зрабіў усяго, што мог. Лён увесь даўно абмалочаны і фазасланы, па 70 проц падышоў са сцеліпчаў, а дзяржаве здана толькі 23 цэнтн. трасты. Ручная пераапрацоўка фактычна не пачата. 4 мялкі бяздзейнічаюць. Толькі ў першай брыгадзе пасадзілі першую ёбню для сушкі трасты.

На нарадзе праўлення калгаса і брыгадзіраў рашылі неадкладна пачаць ручную пераапрацоўку ільну, узмацніць работу на сартаванні трасты і адпраўды лепшай на ільназавод, у бліжэйшыя дні закончыць пад'ёмтотным падворч'я кожны дзень пералежкі трасты — удар па якасці ільнапрадукцыі.

Адначасова з гэтымі работамі брыгады звяртаюць вялікую ўвагу і на зяблева: сюды пераключаюцца аспоўныя сілы цягла і людзей, а пасля заканчэння збожжаздачы — амаль уся цягавая сіла будзе кінута на зяблева.

Калгас уступае ў барацьбу за пярэдніцтва ў сталінскай ільнаэстафеце, за права пасылкі дэлегата на Кастрычніцкае свята ў Менск.

Брыгадзір першай брыгады т. **Мінчанка Змітра** выклікаў на соцспаборніцтва астатніх 3 брыгадзіраў. Выклік прынят.

Хто будзе першым у соцспаборніцтве на хутчэйшае завяршэнне ўсіх палітычна-гаспадарчых задач, — пакажуць бліжэйшыя дні.

А. МІКУЦКІ.

Калгас «Трудавік», Лёзненскага раёна.

Увагу падрыхтоўцы калгасных кадраў

(Ліст курсантаў)

У палатку верасня г. г. пры Мсціслаўскім фінансавым тэхнікуме Наркамземам Беларусі арганізаваны кароткатэрміновыя курсы на падрыхтоўцы інструктароў уліку ў калгасах. Яны разлічаны на 150 чалавек, а займаецца толькі 57. Укамплектаваннем курсаў ніхто не цікавіцца. У свой час ЦК ЛКСМБ узяў на сябе абавязак укамплектаваць курсы выключна комсамольцамі. Але абсалютная большасць райкомаў і да сённішняга дня не прыслалі на курсы ні аднаго комсамольца.

Не гледзячы на кароткі тэрмін навучання, дырэктар курсаў тав. **Жылуноў** не клапоціцца аб стварэнні ўмоў, якія-б забяспечылі высокую якасць вучобы. Падручнікамі і пісьмовымі прыладамі курсанты забяспечаны зусім слаба. Найбольш слабым участкам у рабоце курсаў з'яўляецца выкладанне. Большасць настаўнікаў не даюць курсантам і мінімума неабходных ведаў.

Матэрыяльна-бытавыя ўмовы курсантаў дрэнныя. Якасць абедаў зусім нізкая. У сталовай сістэматычна рас крадаюцца прадукты. Усё гэта робіцца пры поўным патуранні загадчыка сталовай тав. Плотнікава.

Выхаваўчая культмасавая работа сярод курсантаў зусім не праводзіцца. З пачатка заняткаў прайшло ўжо больш месяца, а Мсціслаўскі РК ЛКСМБ на чале з сакратаром т. Бендзелем не патурбаваўся нават з афармленнем комсамольскай ячэйкі на курсах.

Фармальна да працы аднёсся і Наркамзем БССР. Пасля арганізацыі іх ён палічыў ніжэй свайго гонару ўвагі сці ў дэталі работы курсаў. Нават і да сённішняга дня не паклапаціўся аб пастаянным праграме.

Група курсантаў (17 подпісаў).

Кулак ля малатарні

(Ліст калгасніка)

Калгас **«Новы свет»,** Паперненскага сельсовета, **(Менскі раён)** набыў дзве новых малатарні і ў жніўні месяцы прыступіў да малаціцьбы. Кіраваць малаціцьбу даручылі «калгаснику» **Рамзну Лабатаму.**

Хто такі Лабаты? Да ўступлення ў калгас ён меў 16 га зямлі, 3 каровы і шмат іншай дробнай жывёлы. Пры ўступленні ў калгас ўсю сваю маемасць разбазарыў.

Лабаты прыступіў да малаціцьбы як шкоднік. Ён падаваў у малатарню цэлыя снапы, чым затрымліваў яе работу. Калгаснікі ўказвалі Лабатаму, што нельга так падаваць, а ён на гэта гіронічна адказваў: «Я даю цэлыя снапы, каб выкапаць тэмпы».

Нарэшце Лабаты дабіўся сваёй мэты. У часе малаціцьбы малатарня на поўным ходу раптам заніхла. Аказалася, што барабанная шасцярня паламалася.

Праўленне калгаса не звярнула на гэта ўвагі і даручыла Лабатаму другую малатарню, якую ён таксама вывёў са строя.

Брыгада калгаснікаў пасля паломкі двух малатарань сабіралася аб гэтым напісаць у газету, але брыгадзір **Гуравец Ігнат** (сваяк Рамана) за яшчэ: «Кіньце пісаць, абыйдзецца і так».

Куланкім крахадзімцам, шкоднікам калгасных машын, зрыўшчыкам баявых калгасных работ і іх абаронцам, якія замазваюць злачынствы, не месца ў калгасе.

А. Закардонны.

Да суровай адказнасці злачынцаў

На конягадоўчай ферме калгаса «Чырвоны інтэрнацыянал», Асіпавіцкага раёна, да 1933 года было 18 кабыл, 7 штук маладняка і адзін жарабец.

Рукою класавага ворага конскае пагалоўе сістэматычна знішчаецца. З лютага па сённішні дзень запінулі 4 конняматкі, дзве выведзены са строю.

Конюх **Нічыпар Новік** па-зверску адносіцца да коняй. У станках цэлымі суткамі стаяць кабылы ў путах. Яны ніколі не атрымліваюць своечасова корму і вады. Новік не шкадуе для іх вілак, а часамі і абуха.

Прымацаваныя да калгасніка Харытановіча Лявона дзве маткі выбылі са строю, непрыгодны для работы. Адна пад клічкай «Хмара» стаіць цэлы месяц і патрабуе лячэння, другая ад пяжкай працы звергла і пяць дзён стаіць у хляве.

Догляд коняй Новік Нічыпар часта давярае свайму сыну, які быў асуджан на тры гады, і ніякіх адносін да калгаса не мае.

Праўленне калгаса не прымае мер да шкоднікаў, якія губяць конскае пагалоўе. Ці не таму толькі, што і сам старшыня калгаса Дамброўскі таксама перагнаў каня.

Ачысціць кааперацыю воднікаў ад варожых элементаў

(Ліст служачых)

Намеснік старшыні ВОДТСТ Дняпра Дзвінскага басейна **Сліжыкаў** давёў кааперацыю да развала.

Даўней ён працаваў у сельскай кааперацыі ў Журавічах, зрабіў там растраты, за што быў выключан з партыі і знят з работы.

Аднак, ён зноў выплыў на сцэну і пачаў працаваць у Дняпра-Дзвінскім ВОДТСТ намеснікам старшыні, загадчыкам грамадскага харчавання.

Як ён працаваў у час? Ён агідна дрэнна кіраваў грамадскім харчаваннем, па-шкодніцку абслугоўваючы рабочых транспарта. У параходных буфетах і сталоўках дапушчаны былі масавыя растраты і злоўжыванні. У Магілеве растрачана каля 11.000 руб., у Віцебску — 10.000 руб., Бабруйску — 9.000 руб., у Мазыры — звыш 3.000 руб., у Гомелі—23.000 руб. Усяго растрат за 1933 год лічыцца на суму звыш 55.000 руб. Колькасць растратчыкаў 78 чалавек. Большасць з іх, як напр., Рудой, Глезараў, Кобрынскі і інш. працуюць і зараз. За кароткі перыяд у сталоўцы № 5 змянілася 8 загадчыкаў, а работа не палепшылася.

Сліжыкаў загадваў і такім важнейшым участкам, як прыгарадныя гаспадаркі басейна. Ён зусім не кіраваў гэтым участкам работы і давёў гаспадарку да поўнага запяпада: з-за таго, што не былі вырыты канавы, у Гомеле і Віцебску вымаклі пасевы бульбы. У Бабруйску галавацяны парэзалі ўвесь маладняк рагатага ската.

Можна прывесці яшчэ рад фактаў, якія даказваюць, што Сліжыкаў падрываў усю работу. Ён акружыў сябе кампаніяй з былых афіцэраў —Ма шкоўскага, Шкеля, Мосціна, з якімі разам п'янстваваў і рабіў розныя злоўжыванні.

Калектыў ВОДТСТ (дваццаць подпісаў).

П. ШАМШУР

Дні палітаддзела

Ліза падбегла да машыны ўсхліпваючы, выціраючы слёзы разжом пяркалёвай хусткі. Вайнман ужо сядзеў у машыне, а шофер уключаў матор. Няспынныя слёзы і спазмы ў горле перашкаджалі Лізе гаварыць.

— Таварыш палітаддзел. Не магу я. Паглядзіце, як жыву.

Праменні ліхтароў аўтамабіля асвятлілі кінутыя на двары плугі, калёсы без кола, для бульбы, мауклівы трактар. На двары не было людзей. Працоўны дзень у калгасе імя Калініна скончыўся.

Начпаліталдзела Вайнман адчыніў дверцы.

Машына рванулася ўперад. Вецер трапаў кузаў. Асенняя граязь усхліпвала пад шынамі. Вуліца пасёлка раступалася, мільгацелі агнікі ў хатах калгаснікаў.

Расказ Лізы быў кароткім. Яна сёння ехала ў палітаддзел — за 16 клм. ад свайго калгаса. Далёкі царпець не можна. Звярнулася ў палітаддзел. Бацтрачка Ліза Мозала некалькі год таму назад уступіла ў калгас. Мужа - калгасніка прызвалі ў Чырвоную армію. Ліза засталася сумленна працаваць у калгасе імя Калініна. За 1933 г. яна вырашчала ўжо 140 працадзён. Будзе мець не менш 35 пудоў збожжа, каля 140 пудоў бульбы, ды яшчэ іншыя культуры, ды грашыма. Муж вернецца з армії праз год. Жыццё забяспечана. Але жыць няма дзе. Жыла раней Ліза ў добрай калгаснай хаце. Там размешчаны дом праўлення калгаса. Перанесці маемасць Лізы ў другую калгасную хату, дзе жыў раней кандыдат партыі Звягаў. Звягава выбралі старшынёй суседняга калгаса «Чырвоны Мінькаў». Але жонка Звягава засталася жыць у калгасе імя Калініна. І Звягавы не пусцілі Лізы ў хату. Не хоча Звягава перажыджаць у Мінькаў. Рэчы Лізы скінуты ў кутку, спіць яна ў халодных сенцах.

Праўленне, партыйцы калгаса, сельсавет не дапамаглі.

Асцярожна пераскочыўшы машына праз канаўкі, узгоркі. Набягае першая тысяча кіламетраў пройдзенага шляху новага аўтамабіля маркі «ГАЗ».

Шпарка ідзе палітаддзелаўская машына, ясна адкладваючы след на рытвінах калгаснай вуліцы.

Задумаўся начпаліт. Сёння цэлы дзень быў ён у калгасе імя Калініна. Як мала быць дзень у калгасе. Трэба ўжо так будаваць работу, каб некалькі дзён, тыдзень праводзіць у адным калгасе.

Калісці лічыўся калгас імя Калініна адным з лепшых у Ратачоўскім раёне. Для калініцаў калгас стаў адзіным шляхам жыцця. Калі хто небудзь з іх быў незадаволен работай, не паладзіў з праўленнем, дык не аб выхадзе ў аднаасобнікі гаварыў, але аб пераводзе ў іншы калгас.

Моцная калгасная гаспадарка ў калініцаў. У гэтым годзе на працадзень калгасніка прыпадае каля 4 кгр. збожжа, 16 кгр. бульбы, многа прошкі... Амаль у кожнай калгаснай сям'і ёсць свая карова, свінні, куры. Па-заможнаму ўжо жывуць многія калініцы.

Кіруе калгасам адзін з арганізатараў яго, былы служачы чытуні, кандыдат партыі, **Архіпенка.**

Ведае Архіпенка гаспадарку, любіць сваю справу. Але чаму-ж калгас адсталы? Аднакалонні сваіх абавязкаў пестае [illegible] Канаяне бульбы ідзе зусім марудна, здачу бульбы ў лік натуралаты МТС калініцы толькі, толькі пачалі. Нешта перашкаджае...

На выбоіне падкінула машыну. Не аб'ежджаш кожны паваарот шляху. Ліза схапілася за скуру падушак. Праменні ліхтароў выхапілі хату з маленькімі вокнамі, хату, зацінутую высокім плотам — зачынены свет маленькіх клопатаў.

Закурваючы ўспомніў Вайнман, як а месяц назад 2 гадзіны сядзеў у палітаддзеле Архіпенка. Гаварыў аб дробязях, даваў абяцанні, а потым спытаў:

— А ці нельга, таварыш начальнік, дапамагчы нам вагон атрымаць да Ленінграду. Мяркуем гародніну падкінуць, калгасным гандлем... Гэта праўда, уборку не скончылі яшчэ. Але-ж для гэтай справы людзі апойдуцца.

Доўга растлумачваў тады начпаліт шкоднасць такіх гандлярскіх тэндэнцый. Успомніў Архіпенку, як той летась больш гандляваў у Ленінградзе і па Украіне, чым кіраваў калгасам. Лаяў моцна за адставанне ў збожжапастаўках. Растлумачваў палітыку партыі ў калгасным будаўніцтве. Архіпенка камечыў кепку і згадваўся.

Пасля гэтай размовы калгас імя Калініна атрымаў квіток № 2 на здачы збожжа дзяржаве, але-ж цалкам разлічыўся па збожжазатагоўках адным з апошніх.

Сёння на полі саромлёва пашчыпваў вусы Архіпенка. Вецер хупка шпаў цяжкія воблакі, было сцюдзёна і мокра. Бульбу капалі марудна, усяго ў два плугі — выпала на поле 30 жанчын. Дзяржаве яшчэ не пачаў здаваць бульбу калгас, толькі першыя вазы з бульбай паехалі для здачы ў лік натуралаты МТС, а некалькі буртоў на зіму ўжо складзены, некалькі тысяч пудоў бульбы мадрыхтаваны і на насенне, на вясну, на рынак.

Пакаазаў на неба Архіпенка, абяцаў усё выправіць, да тэрміна разлічыцца з пастаўкамі. Старанна абдумваючы кожнае слова, гаварыў:

— Мы сваімі людзьмі не зможам канчыць. Ужо ўсе сілы скарысталі на бульбу. Праўленне рашыла запрасіць аднаасобнікаў. Дадзім ім у дзень па пуду бульбы, ежу. Тады пойдуць. Усё-ж нам выгодна нават на такіх умовах...

Тут-жа, каб не спыняць работу, папрасіў тав. Вайнман склікаць праўленне. Высветлілася: можна і сваімі сродкамі ўбраць бульбу. Шмат людзей не скарыстана на капанні. Бульбакапалка не адрамантавана і не працуе, а між тым работа на ёй паскорыць уборку. Не скарыстаны мужчыны на ўборцы. Ёсць гультаі, якія лічаць, што ўжо зарабілі на зіму і могуць адпачыць.

Калі вячоралі, жонка Архіпенкі скардзілася, што працуе цяпер без выходных дзён і не хапае часу на сваю гас падарку. Ганарыўся Архіпенка, паказваючы добрае калгаснае стада кароў, свінную ферму, на якой у гэтым годзе не загінула ні адно парасё. І маўчаў ён, схіліўшы галаву, хаваючы свае чорныя, разумныя вочы, калі начпаліт дапытваўся, чаму аднаасобнікі не ўступаюць у калгас імя Калініна.

— Вы замкнуліся ў сваёй шкарлупе. Ад такога гандлярства прыбытак толькі табе. Аднаасобнік на ўсё жыццё ідзе ў калгас. У большэвіцкую сям'ю хоча ўступаць. А вы зарабілі і замкнуліся ў чыстых хатках...

Апошні раз ўсхліпнула пашроска. Зваду, уздрыгваючы ад нязвыклай язды, ушчэпіўшы ад нязвыклай язды, ушчэпіўшы ад нязвыклай язды, ушчэпіўш

Працэс аб падпале рэйхстага

Парад ілжэсведак

ПРАГА, 19. (Белта).

З Берлына перадаюць: на пасяджанні 18-га кастрычніка суд адхіліў патрабаванні Дзімітрава даць яму для абаронны экземпляр «Карычневай кнігі».

Дзімітраў патрабуе ад «абаронцы» Тэйхерта заявіць яго з усімі далямі аб падпале, якія змяшчаюцца ў «Карычневай кнізе».

На залуўленне Тэйхерта: «Я гэта зрабіў» Дзімітраў адказвае: «Гэта няпраўда. Вы не інфармавалі мяне».

Суд пераходзіць да допыта заслугоўваючых асаблівай увагі «сведак»—служачых у доме Герынга.

Начны вартаўнік дома Герынга Адэрман на пытанне Дзімітрава аб партыйнай прыналежнасці, заяўляе, што ён раней быў социял-дэмакратам, затым перайшоў «у адну з правых партый». Як відаць, «пераканаўшы» гэтага сведкі змяніліся разам з пераменай гаспадароў у доме старшыні рэйхстага.

Адэрман адразу-ж заяўляе, што да і ў часе пажара ніхто нібыта не прахадзіў у падземны ход, які злучае будынак рэйхстага з домам Герынга. Ён сцвярджае, што, знаходзячыся ў сваім швейцарскім памяшканні, мог «чуць любы шум у падземным ходзе».

Тым часам у гэты вечар ён нічога не чуў. Каб прыдаць больш праўдападобнасці сваім паказанням, Адэрман дабаўляе, што раней ён сапраўды чуў у падземным ходзе «падазроны шум», адначас, суд лічыць за лепшае не займацца гэтай вельмі важнай «абмоўкай» сведкі.

У далейшых паказаннях Адэрман за блытваецца ў супярэчнасцях па пытанню аб наяўнасці атрада штурмавікоў у доме Герынга.

Так, спачатку ён заяўляе, што сцвярджэнні замежнага друку аб наяўнасці штурмавікоў у доме Герынга—хлусня, і што штурмавікі наогул ніколі не бывалі ў гэтым доме. Тым часам агульнавядома, што Герынг нідзе не з'яўляецца без атрада штурмавікоў-ахоўнікаў.

На пытанні, пастаўленыя яму Торглерам, Адэрман прагаварваецца, што ў палацы была асабістая ахова Герынга. Торглер заяўляе, што з закон памяшкання комфракцыі ў рэйхстагу сістэматычна бачылі, як у садзе дома Герынга штурмавікі дрэсіравалі сабаку.

Прыперты да сцяны «сведка» вымушаны прызнаць, што «часамі адзін штурмавік хадзіў з сабакай Герынга ў сад».

На даўторныя сцвярджэнні Торглера, што справа ідзе не аб адным, а аб многіх штурмавіках, Адэрман заяўляе: «Я не ведаю, колькі іх было ўдзень. Я бываў там толькі ноччу».

Пасля допыта Адэрмана суд выходзіць аглядаць падземны ход. Да аглядання не былі дапушчаны ні абвінавачаныя, ні карэспандэнты газет.

Пасля зварота суда ў залу старшыня Бюнгер заяўляе, што сведка Адэрман гаворыць праўду, бо суд пераканаўся, што ў памяшканні швейцара, дзе Адэрман знаходзіўся пры выкананні сваіх службовых абавязкаў, чутно шыбота нават калі хто-небудзь ідзе босым па падземнаму ходу.

Наступныя два «сведкі», таксама служачыя дома Герынга, дасловна паўтараюць паказанні Адэрмана.

Затым суд заслухаў паказанні «сведкі»—начальніка атрада штурмавікоў з асабістай аховы Герынга—Вебера. Як вядома, Вебер разам з Герынгам прысутнічаў на пажары рэйхстага. Вебер заяўляе, што ён тады-ж неадкладна агледзеў падземны ход, аднак, «нічога падазронага не выявіў».

Апошнім паўторна дапытваецца інжы нер Богун, які сцвярджае, што ў часе пажара з рэйхстага выбег чалавек, у якім ён пазнаў Папова. Папоў заяўляе, што Богун хлусіць. У яго паказаннях фігуруе рад супярэчлівых заяў аб галаўным уборы чалавека, якога ён нібыта бачыў. Тым часам вочная стаўка з Богунам адбылася праз месяц пасля падпала рэйхстага. Вось чаму цікава, як мог Богун, бачыўшы тако чалавека позна ўвечары, у цямноце, прызнаць у ім праз месяц Папова.

Гэта тым больш дзіўна,—указвае Папоў,—што пасля цяжкай хваробы ў турме ён, Папоў, страціўшы на пражыгу трох тыдняў 6 кіло вагі, значна змяніўся. Прыперты да сцяны, Богун заяўляе, што «не выключана магчымасць памылкі».

Наступнае пасяджэнне суда заўтра.

ГЕБЕЛЬС ПАТРАБУЕ ПОЛЬСКІ КАЛІДОР

ВАРШАВА, 18. (БЕЛТА).

Друк змяшчае вытрымкі з інтэрв'ю, данага германскім міністрам прапаганды Гебельсам прадстаўніку «Дэйлі мейль».

Гебельс заявіў:

«Зразумела, што мы не можам разглядаць польскі калідор у якасці пастаяннага інстытута. Але мы лічым, што няма ў цэнтральнай Эўропе пытання, якое было-б падставай для вайны. Мы не супакоімся, покуль не вернем калідора, але мы спадзяемся дабіцца гэтага шляхам перагавораў».

«Кур'ер цодзенны» прыводзіць гэта паведамленне пад загалоўкам «Гебельс хоча прагінуць Памор'е шляхам перагавораў».

ФАШЫЗАЦЫЯ ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 18. (БЕЛТА).

Друк лічыць, што на падставе ўнесенага ў парламант урадавага законапраекта аб надзвычайных мерах супроць «антыдзяржаўных партый» падрыхтоўваецца стварэнне канцэнтрацыйных лагераў для «варожых дзяржаве элементаў».

Асабліва заядла выступае ў абарону законапраекта социял-дэмакратычны друк. «Право ліду» падкрэслівае, што законапраект ухвалены трыма социял-дэмакратычнымі міністрамі ўрада.

На ўчарашнім пасяджэнні парламента комфракцыя нацыянальна-прагрэсіўнай супроць прыняцця законапраекта. На пасяджэнні сената з дэкларацыяй компартыі да ўсяго рабочага класа Чэхаславакіі выступіў сенатар Мікулічэк.

У дэкларацыі ўказваецца на узросшую небяспеку вайны і падрыхтоўку новага нападу супроць бядняцкіх народных мас. Гэты паход буржуазіі супроць працоўных мас стаў магчымым перш за ўсё з прычыны дзейнасці галоўнай сацыяльнай апоры буржуазіі — сацыял-фашысцкіх партый.

«Апасаючыся гнева рабочых мас, — заявіў Мікулічэк, — буржуазія хоча ў першую чаргу распусціць компартыю — адзіната правадыра чэхаславацкага пролетарыята. Становішча яснае: на адным баку рэакцыя, фашызм; на другім —рэволюцыя. Компартыя падымае сцяг барацьбы супроць дыктатуры эксплуататараў за ўстанаўленне дыктатуры пролетарыята».

Парламанцкая цэнзура выкрэсліла з гэтай дэкларацыі рад фраз.

***

ПРАГА, 18. (БЕЛТА).

Згодна паведамлення чэхаславацкага агенцтва «на разгляд парламента ўрадам унесен законапраект аб спыненні дзейнасці і роспуску тых палітычных партый, дзейнасць якіх асабліва пагражае дэмакратычнаму рэспубліканскаму дзяржаўнаму ладу альбо бяспечнасці. Тэрмін дзеяння закона да першага студзеня 1935 года.

СЯЛЯНСКІЯ УЗБРОЕНЫЯ ВЫСТУПЛЕННІ Ў ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 18. (БЕЛТА).

Аўруговы суд у Тарнове вынес чарговы прыгавор па справе аб сялянскіх выступленнях у вёсцы Ноцкага (Львоўскае ваяводства).

18 сялян прысуджаны да турмы тэрмінам ад 2 год да 4 месяцаў. Галоўную цікавасць выклікае судовы разбор справы аб паўстанні сялян у Гродзіску і ваколіцах (Кракаўскае ваяводства).

Сведкі пацвярджаюць, што ў сялян мелася зброя. Згодна падлікаў аднаго са сведак, гродзіскія сяляне мелі ў сваім распараджэнні 200 вінтовак і 2 кулямёты.

Згодна паказання паліцэйскага камісара з Ляпцута Навакоўскага, камандаваўшага паліцэйскім атрадам у часе сутычкі з сялянамі, кулацкі правадыр дэпутат сойму Плута, выступаўшы на сялянскім мітынгу ў Ракшаве, усямерна стараўся супакоіць натоўп.

З натоўпа пасыпаліся на яго адрасу пагрозы і абвінавачанні ў здрадзе сялянскім інтарэсам.

— Тады, заявіў камісар Навакоўскі, — дэпутат Плута, стараючыся апраўдацца, прыняў ваш ліст.

ДРУК ГРЭЦЫІ АДЗНАЧАЕ АГРЭСІЎНАСЦЬ ЯПОНІІ

АФІНЫ, 18. (БЕЛТА).

Газеты з вялікай увагай наглядаюць за далёка-ўсходнімі падзеямі. Каментуючы совецка-японскія адносіны, газеты прызнаюць наяўнасць агрэсіўнай японскай палітыкі на Далёкім Усходзе.

СОВЕЦКАЯ ЭСКАДРА У СТАМБУЛЕ

СТАМБУЛ, 18. (БЕЛТА).

Сёння ў Стамбул прыбыла пад камандай тав. РАЛЛЯ совецкая эскадра ў складзе крэйсера «КРАСНЫЙ КАВКАЗ», эсмінцаў «ПЕТРОВСКИЙ» і «ШАУМЯН» і падводных лодак «СПАРТАКОВЕЦ», «РЕВОЛЮЦИОНЕР» і «ЯКОБИНЕЦ».

Эскадра абмянялася салютамі з турэцкай крэпасцю Сулейманіе і кінула якар перад Дольма—Бахчэ.

Эскадра прабудзе ў Стамбуле 3 дні.

ТАВ. ДАУГАЛЕУСКІ АБ ПАЗІЦЫІ СОВЕЦКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ

ПАРЫЖ, 18. (БЕЛТА).

«Пары Суар» апублікавала інтэрв'ю з тав. Даўгалеускім у Жэневе:

«Мы ўжо ўчора заяўлялі, што совецкі ўрад не для таго прадстаўлен на канферэнцыі па раззбраенні, каб совецкая дэлегацыя толькі рэгістравала фактычнае становішча і рашэнні, прынятыя пазіма арганізаў канферэнцыі.

Сёння як і ўчора, совецкая дэлегацыя гатова супрацоўнічаць апісе больш актыўна і жадае, каб канферэнцыя па раззбраенні прыняла да ўсеагульнага істотнага скарачэння ўзбраенняў. Становішча ў Эўропе і па-за Эўропай настойна патрабуе, каб скарачэнне ўзбраенняў было праведзена ў тэрміновым парадку».

ДАЛАД'Е АБ ВЫХАДЗЕ ГЕРМАНІІ З ЛІГІ НАЦЫЙ

ПАРЫЖ. (БЕЛТА).

Пры ўнясенні фінансавага закона-праекта ў палату дэпутатаў прэм'ер Далад'е ўказаў, што выхад Германіі з Ліігі нацый рэпутуе ўносіць новы момант у сучаснае міжнароднае становішча.

Урад, — заявіў ён, — вывучае магчымыя вынікі прынятага Германіяй рашэння. Францыя, не медлячы ні на што, будзе прытрымлівацца па-ранейшаму палітыкі міжнароднага супрацоўніцтва і з гэтага пункта погляду будзе вывучаць створанае становішча, у якім зацікаўлена не толькі Францыя і Германія, але і ўсе дзяржавы. Як і заўсёды, Францыя будзе прадстаўлена на пасяджэнні Ліігі нацый 26-га кастрычніка.

Заклікаючы палату вырашыць фінансавую праблему, Далад'е падкрэсліў, што Францыя не ізалявана. Знешнепалітычная заява Далад'е спрыяльна сустракаецца газетамі розных напрамкаў. Правы друк, за паасобнымі выключэннямі, устрымоўваецца ад нападкаў на ўрад, фармулюючы свае разгалоссі толькі па бюджэтных пытаннях.

ЗАЯВА ГЕНДЭРСОНА

ЖЭНЕВА. (БЕЛТА).

Гендэрсон прыняў дэлегатаў розных нацыяналістскіх арганізацый, якія прымалі ўдзел на былым у Жэневе сходзе «Інтэрнацыянальнай групы па абмеркаванні пытанняў раззбраення».

З прамовамі выступіў Сесіль і некалькі іншых дэлегатаў. Гендэрсон у адказнай прамове дэманстрацыйна падкрэсліў, што выхад Германіі з канферэнцыі па раззбраенні ставіць яшчэ вастрэй, чым да гэтага часу, пытанне аб «ажыццяўленні раззбраення і ахове міра».

Ён заклікаў напружыць усе намаганні да таго, каб «дабіцца поспеха ў справе раззбраення».

Гендэрсон падкрэсліў важную ролю супрацоўніцтва ПАЗШ і СССР на канферэнцыі і ў заключэнне, яўна намякаючы на Германію, заявіў, што нельга дапусціць, каб «пакт Ліігі нацый стаў кавалачкам паперы і каб мір быў парушан».

БІРЖА АДЧУВАЕ НАЖЫВУ

КУРС АКЦЫЙ ВАЕННАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ РАСЦЕ

ПРАГА. 18. (БЕЛТА).

Паведамленне аб выхадзе Германіі з Ліігі нацый і аб адмаўленні прымаць у далейшым удзел у работах канферэнцыі па раззбраенні выклікала на біржы рэзкае павышэнне курсаў акцый ваенных прадпрыемстваў.

Так, акцыі завода «Шкода» за ўчарашні дзень узняліся на 26 крон, акцыі таварыства «Чэшска Мараўска-Кольбэн-Данэк»—на 70 крон, акцыі «Берґшад Хюй генверке» — на 65 крон і акцыі хімічнага канцэрна ў Аўсігу — на 30 крон.

КЛАСАВЫЯ БАІ У КРАІНАХ КАПІТАЛА

НА ПАРОЗЕ УСЕАГУЛЬНАЙ ЗАБАСТОЎКІ ГАРНЯКОЎ БЕЛЬГІІ

ПАРЫЖ, 18 (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Брусселя, рэферыцкімі прафсаюзамі быў праведзен рэферэндум па пытанні аб абвяшчэнні ўсеагульнай забастоўкі. За забастоўку за ўсіх вугальных басейнах было падана каля 80 проц. галасоў. Такім чынам, забастоўка павінна пачацца 22 кастрычніка, калі гаспадары парушаць існуючую працоўную згоду з вуглякопамі. З мэтай устанавіць кантакт у сумеснай барацьбе паміж бельгійскімі і французскімі гарнякамі, 22-га кастрычніка адбудзецца франка-бельгійская пагранічная нарада гарнякоў.

ФРАНЦУЗСКІЯ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКІ ЗАБАСТАВАЛІ

ПАРЫЖ, 18. (БЕЛТА).

У адказ на заклік унітарных прафсаюзаў пачалася забастоўка 2 тыс. тэкстыльшчыкаў у Кастр.

***

ПАРЫЖ, 18. (БЕЛТА).

Учора прадстаўнікі локаўтаваных докераў і прадпрыемстваў вялі перагаворы пры пасрэдніцтве супрэфекта і інспектара працы. Перагаворы не далі ніякіх рэзультатаў, бо прадпрыемцы катэгарычна адмаўляюцца абмяркоўваць пытанне аб тарантаванні ўмоў працы докераў і аб павышэнні заработнай платы.

„ПРАДДЗВЕР'Е СМЕРЦІ"

ПРАЎДА АБ ЛАГЕРЫ ДАХАУ

ВЕНА, 18. (БЕЛТА).

Выходзячая ў Страсбургу газета «Страсбургер нейстэ нахрыхтэн» паведамляе новыя падрабязнасці аб канцлагеры ў Баварыі «Дахаў».

Згодна афіцыяльных даных нацыянал-сацыялістскага друку, за апошнія пры месяцы ў гэтым лагеры загінула 50 зняволеных. Частка была расстраляна «пры спробе ўцякаць», другія пакончылі самагубствам ці памерлі ад «раптоўных хвароб».

Толькі ў вельмі нямногіх выпадках трупы загінуўшых былі аддадены іх сваякам.

Няма ніякага сумнення, што забіта ку ды больш, чым 50 зняволеных, аб якіх паведамляе фашысцкі друк. Не дзіва таму, што ў Германіі канцэнтрацыйны лагер «Дахаў» называюць не турмой, а «праддзвер'ем смерці».

Пасля таго, як у замежны друк стала трапляць надта шмат паведамленняў аб зверствах у гэтым канцлагеры, было пастаноўлена перавесці лагер уплыв так званага дахаўскага балота. Там будзе пабудавана штрафная калонія на 20 тыс. чалавек. У гэтай мясцовасці паветра заражана і ні адзін чалавек не можа выбрацца з гэтага балота.

Аб рабоце калгаса „Свабода", Дзяржынскага раёна, па развіццю свінагадоўлі

Пастанова камісіі выканання пры СНК БССР

Заслухаўшы даклад старшыні калгаса «Свабода» т. РУТКОЎСКАГА і загадчыка фермы т. НАРВІША, камісія выканання адзначае:

а) Калгас «Свабода», маючы 39 гаспадарак, давёў у гэтым годзе плошчу пад збожжавымі культурамі да 304 га супроць 232 га ў 1932 г. На аснове правільнага ўжывання агратэхнікі калгас дабіўся такіх ураджаяў збожжавых, бульбы і кармавых траў, якія далі магчымасць поўнасцю і датэрмінова выканаць пастаўкі збожжа дзяржаве, разлічыцца па натураплаце з МТС, ссыпаць насенныя і страхавыя фонды, забяспечыць на ўсю зіму кармамі калгасную жывёлу і налічыць па працаднях натурай у два разы больш у параўнанні з мінулым годам.

б) Пашырэнне пасеўнай плошчы і павышэнне ўраджайнасці далі магчымасць калгасу «Свабода» паспяхова развіваць жывёлагадоўлю, прычым свінагадоўля ў гэтым калгасе з'явілася найбольш рэнтабельнай галіной. Пачаўшы з 8 свіноматак у 1931 годзе, калгас давёў матачны статак у 1933 годзе да 42, адначасова перавыканаўшы плановае заданне па агульным паголаўі на 84 проц.

Такія поспехі з'явіліся вынікам правільнай арганізацыі працы на ферме, ліквідацыі абязлічкі і ўвядзення здзельна-прэміяльнай аплаты працы. Калгас у гэтым годзе ўжо налічыў брыгадзіру жывёлагадоўчай брыгады 122 працадні, а свінарам па 339 працадзён. Правільная арганізацыя працы і добрая аплата спрыялі зацікаўленасці калгаснікаў у доглядзе, кармленні і захаванні маладняка, дзякуючы чаму ў 1933 годзе спынена прахалошчванне свіноматак, атрымана 1,5 апароса на свіноматку з выхадам 8,6 дзелавых парасят, пры зніжэнні адыхода маладняка да 5 проц.; жывая вага парасят дасягае ў часе адбрання ад маткі 10-12 кіло і ў 6-месячным узросце да 43-х кіло.

в) Калгас па-большэвіцку праводзіць падрыхтоўку фермы да зімоўкі — перадаў кармы загадчыку фермы, пабудаваў новы свінарнік, бульбахавальнік, засілсаваў 80 тон сіласа, канчае будаўніцтва студні.

г) Пералічаныя поспехі ў галіне калгаснага будаўніцтва калгас «Свабода» атрымаў на аснове ажыццяўлення дырэктыў партыі і ўрада аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, на аснове разгортвання соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Калгас першым у БССР адгукнуўся на адозву калгаса імя Калініна, Маскоўскай вобласці, уключыўся па-сапраўднаму ва ўсесаюзны конкурс на лепшую жывёлагадоўчую ферму, упарта вядзе далейшую барацьбу за большэвіцкі калгас, за заможнае жыццё калгасніка, ліквідуючы ў гэтым годзе бескаўпасць калгаснікаў шляхам надзялення цёлкамі 5-ці ўдарнікаў, якія не маюць кароў.

Камісія выканання пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Даручыць НКзямляробства, пад адказнасць тав. Лазоўскага ўзяць ферму калгаса «Свабода» на асобны ўлік, аказваючы ёй у далейшым неабходную дапамогу.

2. Ухваліць мерапрыемствы НКзямляробства і газеты «Звязда» па давядзенню адозвы калгаса «Свабода» да ўсіх калгаснікаў БССР і прапанаваць НКзямляробства і РВК разгарнуць шырокую масавую кампанію за ўдзел калгасных таварных ферм у конкурсе на лепшую жывёлагадоўчую ферму.

3. Даручыць НКзямляробства прэміяваць лепшых калгаснікаў-ударнікаў калгаса «Свабода» за добрыя паказальнікі працы па развіццю свінагадоўлі.

4. Даручыць дзяржынскаму РВК, дырэктару і начпалітаддзела МТС узмацніць кіраўніцтва калгасам «Свабода», і лепшыя ўзоры яго вытворчай працы перанесці ў іншыя калгасы.

Старшыня камісіі выканання пры СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар камісіі выканання пры СНК БССР ЮРАШКЕВІЧ.

Прызыўнікі 1911 г. на медаглядзе.

ШТО РОБІЦЦА Ў ЖАКЦЕ № 15?

У мінулым годзе жакт № 15 лічыўся адным з перадавых жактаў у горадзе. Бывала так: не паспее жыхар падаць заяву аб рамонце кватэры, яму на заўтра-ж насылаюць рабочых.

Зусім не тое цяпер. Заявы жыхароў ляжаць у партфелі старшыні праўлення Гузавера па 5-6 месяцаў. Заявы нават не разглядаюцца.

А вось разбурыць што-небудзь у жакце шмат боль спецаў. Быў такі факт. У пачатку жніўня ў кватэру № 35 па Ленінскай прыйшлі рабочыя на чале з членам праўлення Шульманам і пачалі ламаць печ у кухні.

— Што вы робіце? — запытаў жыхар.

— Мы тут думаем пакой зрабіць, — адказаў Шульман. Жыхары запратэставалі, даказваючы, што дзе сям'я без кухні застацца не могуць. Але пратэсты жыхароў не дапамаглі. Печ была раскідана. Калі-ж жыхары пачалі скардзіцца ў вышэйшыя органы, праўленне сны ніла работы ў кухні, але печы не адрамантавала. Так і засталася печ разбуранай да гэтага часу.

Другі факт. У жакце загадчыкі гаспадаркай меняюцца амаль кожны месяц. Працаваў раней нейкі Міньковіч. Ён справу правяліў. Яго замяніў Брудзько. Гэты абжульнічаў праўленцаў, за жактаўскія пропшы кожны дзень п'янстваваў. Нагогул у жакце часта знаходзяць сябе прыпулак якулікі. У кватэру жыхара таго-ж дома № 35 па Ленінскай прыйшлі нейкія жулікі пад відам печнікоў. Жыхар кватэры быў у камандыроўцы і прыпошчыны «печнікі» ўкралі ў жонкі жыхара 40 рублёў і змыліся, не адрамантаваўшы печкі.

За аднаго капя трэба праўленне жакта здаць пад суд: вось на працягу 5 месяцаў жактаўскі копь вісіць на вяроўках, бо як ляжа, трэба збіраць жыхароў, каб яго падняць.

Гаржылсаюз павінен, нарэшце, зацікавіцца работай праўлення жакта № 15.

А.

Падрыхтоўка педагогаў для польскіх школ

Па БССР з кожным годам расце колькасць польскіх школ, пашыраюцца існуючыя школы. 257 пачатковых школ — аднакамплектных і двухкамплектных, 56 фабрычна-заводскіх сямігодак і школ калгаснай моладзі поўнасцю здавальняюць запатрабаванні на сельніцтва польскай нацыянальнасці. У пачатку гэтага навучальнага года ў пяці раённых чатырохгодках АДКРЫТЫ ПЯТЫЯ ГРУПЫ. Узмоцненым тэмпам ідзе падрыхтоўка кадраў. Пры вышэйшым педагагічным інстытуце ў Менску і педагагічным інстытуце ў Гомелі адкрыты польскія секцыі. У Дзяржынскім польскім нацыянальным раёне функцыянуюць педагагічны тэхнікум і рабфак. Усяго рыхтуецца капя 350 высокакваліфікаваных педагогаў. Упяршыню пільскія школы атрымалі ў гэтым годзе стабільныя падручнікі на польскай мове.

Паведамленні

21 кастрычніка а 6-ай гадзіне ўвечары ў памяшканні сталовай пры кіраўніцтве спраў СНК ПАЧЫНАЕЦЦА ЧЫСТКА ЯЧЭЙКІ КП(б)Б ПРЫ СНК.

Рабочыя і служачыя гор. Манска запрашаюцца прыняць актыўны ўдзел у чыстцы.

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.

Рэспубліканская камісія па чыстцы паведамляе, што 29 кастрычніка г. г. у Асвеі будзе засядаць рэспубліканская камісія па разгляду апеляцый на пастанову асвейскай райкамісіі наступных т. т.: Драгуна А. М., Куліненка М. А., Шыпенка І. Д., Кагэн З. А., Нагібаў М. В., Лебедзь А. А., Заляцы І. С., Анікіевіч П. С., Костка Б. Х.

РЭСПУБЛІКАСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

***

Рэспубліканская камісія па чыстцы паведамляе, што 25 кастрычніка г. г. у 10 гадз. раніцы ў г. Менску (ЦКК, Совецкая, 55) будзе засядаць рэспубліканская камісія па чыстцы наступных т. т.:

Дамброўскі І. Б., Федарсвіч М. М., Карамазава М. Ц.

Пугачоў І. Ф., Курылёнак С. П., Сегін Г. І., Высоцкі І. І., Зікрацкі П. І., Баброў І. Я., Рагачоўскі Ф. П., Палкоўскі П. І., Трусаў П. П., Гарбуль П. П. (плешчаніцкай партарганізацыі).

Ерчак І. П., Гутман Н. М., Вішнеўскі І. В., Петраноўскі П. З., Жукоўскі Е. Б., Кананові́ч Г. Н. (лагойскай партарганізацыі).

Лук'янаў В. І., Мяхнач І. Е., Гордзеў М. І., Шабуневіч А. К., Цярэшка Н. В., Дубавік С. М., Грышкевіч К. М. (уздзенскай партарганізацыі).

Гольдберг (бабруйскай партарганізацыі).

Сіпчанка П. І. (попацкай партарганізацыі).

РЭСПУБЛІКАСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня. Замежны фільм ЯКІ З ДВУХ?

Кіно Інтэрнацыянал БАНДЫТКА

Кіно „Пролетарый" Замежны фільм КЛІНОК КЕРСТЭНБРУКА

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр ДВА ДРУГА МАДЭЛЬ І ПАДРУГА камедыя ў 7 частках

„СПАРТАК" Каса з 4-х гадзін дня. Усходні мастацкі фільм ПЕРШАЯ І АПОШНЯЯ драма ў 7-мі частках

Бабруйская аўтаманцёрная школа дарбудвуча

паўторна даводзіць да ведама ўсіх асоб падаўшых свае дакументы для паступлення ў памянёную школу ў асенні прыём гэтага года, што у сувязі з рэорганізацыяй гэтай школы ў курсавую базу, усе дакументы ў, вераснi месяцы г. г. былі накіраваны Гомельскаму аўтадарожнаму тэхнікуму, а таму асобы, жадаючыя атрымаць свае дакументы, павінны звярнуцца ў гэты тэхнікум па наступнаму адрасу: г. Гомель, Совецкая вул., № 76, аўтадарожнаму тэхнікуму. ДЫРЭКЦЫЯ.

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ Беларадзялення „СОЮЗОРГУЧЕТ" арганізуе 5-месячную групу па падрыхтоўцы СТАРШЫХ БУХГАЛТАРОЎ для сістэмы Наркамсняба БССР.

Стыпендыя ад 125 да 175 руб. і натэрных 25 руб. у мес. Інтэрнатам курсанты не забяспечваюцца.

Прымаюцца бухгальтары, памбухі або рахункаводы не менш як з 2-гадовым рахунковым стажам па падвойнай бухгальтарскай сістэме.

Заявы з дакументамі: аб саслужбовішчы і паходжанні, аб адукацыі (не менш 7-мі груп), аб узросце (не менш 18 г.), аб адносінах да вайсковай павіннасці, аб стажы і аб вызваленні ад апошняга месца работы прымаюцца ў канцылярыі навучальнага камбіната „Союзоргучета"—Менск, Міхайлаўская, 1-а, 7 да 10 гадз. веч. і ў Бел. адз. „Союзоргучет"—Менск, Комуністычная 15, ад 10 да 12 гадз. дня.

Прыём заяў да 25 кастрычніка г. г. Заявы без усіх пералічаных дакументаў разглядацца не будуць.

Навучальны камбінат „СОЮЗОРГУЧЕТ".

У аддзел аб'яў званіце па тэлефону 21-360

НЕ ЧАКАЙЦЕ апошніх дзён ПАДПІСКІ

НА ГАЗЕТЫ:
„ЗВЯЗДА" Орган ЦК і Мен. ГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР
„ОРКА" (на польскай мове) Орган ЦК КП(б)Б,
„РАУДОНАСІС АРТОЯС" (на літоўскай мове) Орган ЦК КП(б)Б

НА ЧАСОПІСЫ:
„БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ" Орган ЦК КП(б)Б.
„БОЛЬШЭВІЦКІ ДРУК" Часопісь культпропа ЦК КП(б)Б.
„Работніца і калгасніца БССР" Выданне ЦК КП(б)Б.

ПАМЯТАЙЦЕ, ШТО СВАЧАСОВАЯ ЗДАЧА ПАДПІСКІ ЗАБЯСПЕЧЫЦЦА ЛЕПШАЙ ГАРАНТЫЯЙ АКУРАТНАЙ ДАСТАЎКІ ГАЗЕТ І ЧАСОПІСЯЎ

Апошні тэрмін прыёма падпіскі на лістапад—26 кастрычніка. Пасля гэтага тэрміна падпіска ні ў якім разе прымацца не будзе

СПЯШЫЦЕ ПАДПІСАЦЦА!

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: МЕНГАРБЮРО САЮЗДРУКУ (Ленінская, 34, другі паверх) у гарадох—ГАРБЮРО САЮЗДРУКУ і раёнах—РАЙБЮРО САЮЗДРУКУ. Таксама тыражнымі работнікамі саюздруку, лістаносцамі, якія маюць на гэта пасведчанне і ўсімі кіёскамі па продажы газет.

САЮЗФОТА

абвяшчае падпіску на ФОТА-СЕРЫЮ „ГИГАНТЫ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ СТРОЙКИ"

Да XVI гадавіны Кастрычніка Саюзфота выпускае серыю «Гиганты социалистической стройки».

На 100 аркушах, памерамі 18×24 і 15 × 40, серыя паказвае і пярэдніцаў 1-ай пяцігодкі (Сталінградскі трактарны, Ростсельмаш і інш.), і буйнейшыя прадпрыемствы, уступіўшыя ў строй у 1933 годзе (Азоўсталь, Крамматорскі, Беламорскі камбінат і г. д.).

Серыя адхіляе як гиганты цяжкай прамысловасці, так і галоўнейшыя аб'екты мін. гаспадаркі (электрастанцыі, транспарт, саўгасы і г. д).

Кожны здымак суправаджаецца падрабязным тэкстам, змешчаным на самім аркушы. У тэксце лічбовыя паказальнікі і характарыстыка народна-гаспадарчага значэння прадпрыемства.

У серыі рад дыяграм, паказваючых у лічбах перамогі социялістычнага будаўніцтва.

Серыя з'яўляецца не толькі выстаўчным матэрыялам да XVI гадавіны Кастрычніка, але разлічана і на выкарыстанне не для паставанай выстаўкі, якую можна ў далейшым дапоўніць свежым фотаматэрыялам і тэкстам.

Цана серыі — 115 рублёў.

Грошы перавядзіцца на разліковы рахунак Саюзфота за № 5809 у маск. абл. к-ры Дзяржбанка, абанэякова адначасова з заказам, без чаго апошні не выконваецца.

Заказы і грошы накіроўваць:

«Союзфота», Москва, ул. 25 Октября (б. Никольская), д. № 4, і ўсім аддзяленням Саюзфота (Масква, Ленінград, Самара, Варонеж, Кіеў, Растоў-Дон, Свярдлоўск, Казань).

Да ведама учотных работнікаў прадпрыемстваў МТС, калгасаў і ўстаноў.

Беларускае аддзяленне „СОЮЗОРГУЧЕТ" арганізавала

КАНСУЛЬТАЦЫЮ, разавую і сістэматычную па пытаннях: арганізацыі учота, увядзення гасразліку, укаранення нарматыўнага ўчота, механізацыі ўчота, капіручота, нармавання рахункоўй працы.

Па калгасному учоту кансультацыі пісьмовыя і вусныя даюцца бясплатна і па-за чаргі.

Адрас: Менск, Комуністычная, 16.

Вусна кансультацыі даюцца штодзенна, з 2-х да 4-х гадзін дня. Паперадні запіс па тэл. № 23-721.

Прымаецца падпіска на гадавую кансультацыю (па абаненту).

Бел. адз. „СОЮЗОРГУЧЕТ".

Смілавіцкі с. г. тэхнікум раслінаводства

АБВЯШЧАЕ НАБОР НА 3-МЕСЯЧНЫЯ ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ

пры тэхнікуме ў колькасці 60 асоб з адукацыяй не ніжэй 6 гр. сямігодкі, для студзеньскага набора ў тэхнікум

Курсанты карыстаюцца правамі студэнтаў тэхнікума.

Прыём заяў да 25-X-33 года.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАЛГАСНАЯ ШКОЛА ПРЫ НКЗБ

(м. Копысь, Аршанскі раён) згодна пастановы Наркамзема Беларусі

абвяшчае набор

на наступныя аддзяленні: 1) аддзяленне старшынь калгасаў, 2) загадчыкаў калгасных таварных ферм. Тэрмін навучання—5 месяцаў. Прымаюцца асобы, маючыя двухгадовы стаж кіраўчай работы ў калгасе. Адукацыя—не менш 4-х груп семігодкі. Узрост—ад 20 да 40 год. Слухачы забяспечваюцца інтэрнатам, грамадскім харчаваннем і стыпендыяй ад 100 да 150 руб. у месяц. Усе паступаючыя павінны мець: засведчаную анкету, камандыроўку ад райзо, або (РК КП(б)Б), характарыстыку аб працы ад адпаведных арганізацый. Прыём заяў да 10-га лістапада 1933 г. Іспыты—з 15 па 18-XI г.г.

Дырэкцыя.

Усебеларускі індустрыяльны тэхнікум будматэрыялаў

абвяшчае набор на падрыхтоўчыя курсы

для студзеньскага набора. Прымаюцца асобы, маючыя адукацыю за 6 груп. Заявы прымаюцца да 30-X-33 г. Дакументы тыя-ж, што і пры паступленні ў тэхнікум. Інтэрнатам і стыпендыяй прынятыя будуць забяспечаны. Заняткі—з 1 лістапада. Адрас: Гомель, Ветравая, 50.

Дырэкцыя.

Марына-Горскі садова-гародны тэхнікум,

які рыхтуе аграномаў, плодаводаў, гародникаў сярэдняй кваліфікацыі,

абвяшчае набор на падрыхтоўчыя трохмесячныя курсы.

На курсы прымаюцца асобы з веданні 6 груп сямігодкі. Курсанты забяспечваюцца стыпендыяй. Інтэрнатам сталоўкай. Пачатак заняткаў 1-га лістапада. Заявы з дакументамі аб узросце саўстановішчы, паходжанні і адукацыі дасылаць па адрасу: п.-а. Марына-Горка, садова-гародны тэхнікум.

Дырэкцыя.

ЗАВОЧНЫ СЕКТАР

магілеўскага педінстытута

абвяшчае, што асенні прыём на заочнае навучанне

працягнут да 1-га лістапада на наступныя аддзяленні: 1) сацыяльна-гістарычнае, 2) сацыяльна-эканамічнае, 3) літаратурнае і мовазнаўчае.

Прымаюцца асобы, маючыя сярэднюю адукацыю—рабочыя, калгаснікі, настаўнікі, служачыя, без адрыва ад вытворчасці.

Заявы накіроўваць па адрасу: г. Магілеў, БССР, Ленінская, 35, педінстыту, заочны сектар.

Да заявы неабходна прыкласці наступныя дакументы: даведку аб асвеце аб сацыяльным паходжанні, засведчаную анкету.

Дырэкцыя.

Гомельскі дзяржаўны педагагічны інстытут

адкрывае прыём на трохмесячныя падрыхтоўчыя курсы. Скончыўшыя залічваюцца студэнтамі інстытута